ПРА ШТО МАРАЦЬ ШКОЛЬНІКІ

МС

ПОШУКІ «КРОТУСА ГЕНУСА»

5

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

19 САКАВІКА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 51 (29420)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:

«Без перабольшання беларуская дзяржаўнасць — гэта старажытная дзяржаўнасць у Еўропе, хто б што ні казаў. І пра гэта трэба шырэй і больш расказваць, пачынаючы ад гісторыі такіх перыядаў, як Полацкае і Тураўскае княствы, Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая і гэтак далей. На сучасным этапе Беларусь валодае неабходнай дзяржаўнасцю, межамі, захоўвае сваю культуру, традыцыі і гісторыю. Нам трэба больш смела адстойваць нацыянальныя інтарэсы, справядлівасць і праўду беларускага народа».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Заканадаўства павінна папярэджваць магчымыя пагрозы»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях удасканалення заканадаўчых актаў у сферы забеспячэння нацыянальнай бяспекі і аховы грамадскага парадку

Фота БелТА.

У нарадзе ўзялі ўдзел прэм'ер-міністр, спікеры абедзвюх палат парламента, кіраўніцтва Адміністрацыі Прэзідэнта, Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі, Апаратыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце, кіраўнікі Вярхоўнага суда, Камітэта дзяржкантролю, Камітэта дзяржбяспекі, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Следчага камітэта, Генеральны пракурор, міністры юстыцыі і ўнутраных спраў.
Гэта своеасаблівая зверка гадзіннікаў пасля даручэнняў, якія былі дадзеныя кіраўніком дзяржавы ў канцы студзеня.

«Паўтара месяца таму мы з вамі ўжо абмяркоўвалі, ці адпавядае наша заканадаўства абстаноўцы, якая склалася. Наколькі яно эфектыўна дазваляе рэагаваць на сучасныя выклікі, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Напэўна, гэта адна з галоўных задач любога заканадаўства. Выснова была зроблена адназначная: ***неабходная карэкціроўка па ўсіх напрамках крымінальнага, працоўнага і іншага заканадаўства***».

Аб'ектыўнай асновай для гэтага, па словах беларускага лідара, з'яўляецца запыт, перш за ўсё, простых грамадзян на забеспячэнне грамадскай бяспекі, захаванне парадку і міру ў краіне.

СТАР. 2

Сям'я мацуецца... рыбалкай

Віктар і Святлана ДРАЗДЫ са сталіцы, якіх я сустрэў на Вілейскім вадасховішчы ў той час, калі яны ўстанаўлівалі цёплую палатку для рыбалкі на лёдзе (балазе, надвор'е яшчэ дазваляла), часта вандруюць па беларускіх азёрах.

— Мы не любім сядзець у чатырох сценах, наша стыхія — прырода, чыстае паветра, рыбалка, у тым ліку і зімовая, — падзяліліся сужэнцы падчас нашага знаёмства. — Хутка завяршэнне сезона падлёднай лоўлі, таму мы прыехалі ў сваё любімае месца.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРОТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў ваеннаслужачых, супрацоўнікаў і ветэранаў унутраных войскаў з прафесійным святам — Днём унутраных войскаў.**
- Дадатковыя сацгарантыі будуць давацца беспрацоўным за пяць гадоў да пенсійнага ўзросту.
- **Універсітэт МНС 27 сакавіка правядзе дзень адчыненых дзвярэй анлайн.**
- Выстаўка-форум Ecology Expo — 2021 і XVI Рэспубліканскі экалагічны форум пройдуць 3—5 чэрвеня ў Мінску.
- **Мінтранс уводзіць сезонныя абмежаванні нагрузак на рэспубліканскіх дарогах.**
- Прафсаюзы Мінскай вобласці і школьнікі навялі парадак каля мемарыяла ў вёсцы Кіршы.

Спецыяльны рэпартаж

АД ПАШТОВАЙ ДА ШЧАСЛІВАЙ

Носяць пошту і ў завіруху, і ў спякоту

На ўскрайку Віцебска ў населеным пункце Тулава, аказваецца, ёсць вуліца Паштовая. Было вельмі цікава пабываць менавіта там, каб даведацца пра напружаныя будні паштовага ведамства.

Карэспандэнт «Звязды» на свае вочы ўпэўніўся, як высокапрафесійна працуюць паштавікі — пры любым надвор'і. Іх многія з тых, хто карыстаецца гэтымі паслугамі, чакаюць, як сваякоў, з якімі заўсёды прыемна сустрэцца, пагутарыць, абмеркаваць навіны.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2021 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

«Заканадаўства павінна папярэджваць магчымыя пагрозы»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пра ўсе змяненні ў гэтай сферы заканадаўства людзі павінны быць праінфармаваныя загадзя, акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

«Папярэдзіць, калі гэта будзе патрэбна, пра ўзмацненне жорсткасці тых або іншых артыкулаў нашых законаў і заканадаўства ў цэлым, каб яны ведалі, калі ідуць на нейкія дзеянні, ці будуць распачатыя супраць іх адпаведныя санкцыі, ці не, — растлумачыў ён. — Гэта значыць, людзі загадзя будуць папярэджаныя і будуць ведаць, хоць няведанне закона не вызваляе ад адказнасці за яго невыкананне».

Заканадаўства павінна не проста аператыўна рэагаваць на любыя парушэнні, але і папярэджваць магчымыя пагрозы, агучыў Аляксандр Лукашэнка яшчэ адно важнае патрабаванне.

Пасля студзеньскай нарады ў парламенце, Адміністрацыі Прэзідэнта, Дзяржаўным сакратарыяце Савета Бяспекі і іншых ведамствах, перш за ўсё сілавых, падрыхтавана каля дзесяці законапраектаў, паведаміў кіраўнік краіны і даручыў у найбліжэйшы час

Фота БелТА

не толькі разгледзець гэтыя дакументы ў парламенце, але і аператыўна ўвесці іх у дзеянне.

У якасці добрага прыкладу кіраўнік дзяржавы прывёў Расійскую Федэрацыю, якая пасля падзей у Беларусі прыняла некаторыя законы, у тым ліку ў сферы супрацьдзеяння гераізацыі нацызму. «Гэта вельмі важнае для нас пытанне, — заўважыў беларускі лідар. — Яны ў гэтым кірунку зрабілі канкрэтныя крокі. Чаму б не скарыстацца гэтым вопытам? Так, як яны скарысталіся нашым горкім вопытам».

Згодна з паведамленнямі беларускіх спецслужбаў, дэструктыўная актыўнасць у краіне працягваецца, паведаміў Прэзідэнт. Таму дзяржаўнай сістэме трэба быць гатовай да любых яе праяў: ад заклікаў да незаконных забастовак да маніпулявання свядомасцю людзей з дапамогай інтэрнэт-тэхналогій, папярэдзіў ён. На кожны падобны крок у арсенале сілавых і іншых дзяржаўных структур павінны быць адэкватныя інструменты рэагавання, адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы задаў удзельнікам нарады шэраг пытанняў. Якія асноўныя змяненні плануюцца ў крымінальным заканадаўстве? Наколькі сістэмна яно перагледжана? Ці ў поўнай меры забяспечваецца ахова канстытуцыйнага ладу?

«Пры гэтым яшчэ раз хачу падкрэсліць: ***размова не павінна ісці толькі пра закручванне гаек,*** — заявіў беларускі лідар. — ***Недзе павінна быць і ўзмацненне адказнасці, а недзе, як мы працавалі над іншымі кодэксамі, напрыклад, павінны быць і паслабленні».***

Людзі мусяць убачыць гэтыя законы, азнаёміцца з іх зместам і выразна зразумець, якія будуць наступствы за іх невыкананне, паўтарыў ён.

Другі блок парадку дня нарады датычыўся барацьбы з экстрэмізмам, забеспячэння нацыянальнай бяспекі і аховы грамадскага парадку. Трэці — навядзення парадку ў асобных праваахоўных органах, перш за ўсё, у адвакатуры, абазначыў Прэзідэнт.

«Асноўная задача гэтага прававога інстытута — абарона законных інтарэсаў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання. Як яны трымаюцца закона?» — спытаў кіраўнік дзяржавы і падкрэсліў, што пытанне павінна быць разгледжана без спроб паставіць некага на калені і нахіліць, але па прынцыпе: «вінаваты — адказвай, невінаваты — ідзі працуй».

Што яшчэ трэба, каб беларускія грамадзяне маглі спакойна жыць і працаваць, а дзяржслужачыя і ваенныя — выконваць свой абавязак, спытаў у завяршэнне ўступнага слова беларускі лідар.

«Вось гэтыя ўкіды ў інтэрнэт, персанальныя даныя, пагрозы сем'ям, дзецям — гэта павінна выпальвацца гарачым жалезам», — акцэнтаваў увагу ён.

За апошні час праведзены маштабны аналіз заканадаўства, далажыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка. «Прававыя нормы вывучалі ў праламленні падзей паслявыбарнага перыяду і неабходнасці папярэджання новых магчымых формаў дэструктыўнай актыўнасці, — сказаў ён. — У гэтых мэтах работа вялася адразу па некалькіх кірунках. Для гэтага на пляцоўках Адміністрацыі Прэзідэнта і Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі былі створаны дзве рабочыя групы. Першая займалася непасрэдна ўдасканаленнем кодэкса — пытаннямі крымінальнай адказнасці, другая каардынавала дзеянні па карэкціроўцы заканадаўства ў сферы грамадскай бяспекі».

Паміж групамі было наладжана ўзаемадзеянне на ўзроўні як кіраўніцтва, так і экспертаў, дадаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

• У тэму

У найбліжэйшы час каля дзесяці законапраектаў будзе ўнесена ў парламент

Пра гэта Ігар Сергеенка паведаміў журналістам пасля нарады.

Паводле яго слоў, завершана работа па комплексным пераглядзе крымінальнага заканадаўства. «Гэта вялікі пласт праблем. Прапанаваныя меры накіраваны на тое, каб забяспечыць грамадскую бяспеку з улікам практыкі апошняга года, — сказаў Ігар Сергеенка. — Шэраг мер накіраваны на ўзмацненне абароны тых супрацоўнікаў, якія забяспечваюць гэтую бяспеку, — супрацоўнікаў МУС, дзяржапарату, ваеннаслужачых».

Пры ўдасканаленні заканадаўства перагледжаны шэраг артыкулаў Крымінальнага кодэкса. У прыватнасці, выключаны составы правапарушэнняў, якія цяпер неактуальныя або па іх магчымае прыцягненне вінаватых асоб да адміністрацыйнай адказнасці. «З аднаго боку, па асобных составах уведзены новыя артыкулы, якія будуць узмацняць крымінальную адказнасць за парушэнні, у тым ліку законаў аб масавых мерапрыемствах. А па частцы артыкулаў адказнасць, наадварот, будзе больш мяккая», — паясніў Ігар Сергеенка.

У ліку заканадаўчых ініцыятыў — прапанова даць судам права самастойна прымаць рашэнне і прымяняць гібкія падыходы па назначэнні пакарання. «Гэта ў першую чаргу замена тых пакаранняў, дзе прадугледжана пазбаўленне волі, на абмежаванне волі», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Паводле яго слоў, з улікам міжнароднага вопыту прапануецца ўзмацніць адказнасць за ўхіленне ад выплаты падаткаў, увесці паняцці «значны», «буйны» і «асабліва буйны памер».

Адзін з законапраектаў, які плануецца ўнесці ў парламент, датычыцца недапушчэння рэабілітацыі нацызму. Ігар Сергеенка звярнуў увагу на тое, што падрыхтоўка гэтага дакумента вядзецца з мінулага года. Пры рабоце над законапраектам выкарыстоўваўся і расійскі вопыт. У дакуменце зроблены акцэнт на прафілактычны складнік, каб не дапусціць рэабілітацыі нацызму і здзяйснення сур'ёзных злачынстваў у гэтай сферы. З дадзенай мэтай агаворваецца шэраг мерапрыемстваў ідэалагічнай скіраванасці.

«У цэлым усе ўдзельнікі нарады падыходы да змянення заканадаўства ўхвалілі. Выказаны асобныя заўвагі, якія будуць улічаны ў ходзе дапрацоўкі. Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача, каб усё было ўлічана, зыходзіла ад практыкі і так, каб нашы грамадзяне даведаліся пра гэта загадзя — пра законы, якія будуць прынятыя, якая адказнасць будзе ўводзіцца па тых ці іншых артыкулах», — падсумаваў Ігар Сергеенка.

Генеральная пракуратура ініцыявала ўзмацненне і канкрэтызацыю ў заканадаўстве адказнасці за экстрэмісцкую дзейнасць

Аб гэтым расказаў Генеральны пракурор Андрэй Швед.

«Мы прааналізавалі вопыт падзей мінулага года, улічылі заканаўства і вопыт іншых краін, у тым ліку Расійскай Федэрацыі, і падрыхтавалі адпаведны праект закона, у адпаведнасці з якім канкрэтызуецца паняцце, што такое экстрэмізм у Рэспубліцы Беларусь — гэта любая супрацьзаконная дзейнасць, якая накіравана ў тым ліку на тэрытарыяльную цэласнасць, суверэнітэт нашай дзяржавы, канстытуцыйны лад, грамадскую бяспеку, — расказаў ён. — Удакладнена паняцце экстрэмісцкіх матэрыялаў, цяпер гэта не толькі інфармацыйная прадукцыя, але і любая атрыбутыка, сімволіка, якая выкарыстоўваецца з дадзенай мэтай. Гэта вельмі важна».

Пашыраны паўнамоцтвы шэрагу дзяржаўных органаў, у тым ліку органаў пракуратуры. Цяпер разам з Генеральным пракурорам пракурорам абласцей і горада Мінска прапануецца даць права прыпыняць дзейнасць арганізацый, калі ў іх дзейнасці ёсць прыкметы экстрэмізму, і ініцыяваць перад судом пытанні пра іх ліквідацыю, дадаў Андрэй Швед. Сама працэдура ліквідацыі такіх арганізацый прапануецца ў паскораным парадку, сказаў ён.

«Міністэрству ўнутраных спраў, Камітэту дзяржбяспекі разам з пракуратурай прапануецца таксама даць права вынясення прадпісанняў аб выпраўленні парушэнняў закона, які накіраваны на супрацьдзеянне экстрэмізму, у выпадку ігнаравання гэтых прадпісанняў дзейнасць юрыдычных асоб будзе спыненая, — працягнуў Генеральны пракурор. — На МУС прапануецца ўскласці вядзенне банка даных асоб, якія былі выкрыты ў экстрэмізме, гэта як фізічныя асобы, так і юрыдычныя. Акрамя таго, у Крымінальны кодэкс унесены адпаведныя карэкціроўкі з тым, каб асобы, якія здзяйсняюць экстрэмісцкія дзеянні, прыцягваліся ў тым ліку да крымінальнай адказнасці».

Упершыню будуць канкрэтызаваныя ўсе віды дзейнасці, якія могуць быць аднесены да экстрэмісцкай, такія як вярбоўка, навучанне, падрыхтоўка, схіленне, — гэта значыць любая форма дзейнасці, звязаная з экстрэмізмам, будзе мець крымінальна-прававую ацэнку, заўважыў кіраўнік ведамства.

У заканадаўстве з'явіцца дадатковая адказнасць для аўтараў, якія распаўсюджваюць «фэйкі»

Пра гэта расказаў намеснік Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Аляксандр Рахманаў.

Ён адзначыў, што падобныя навацыі ў апошні час укараняюцца ў заканадаўстве цэлага шэрагу замежных дзяржаў. Аляксандр Рахманаў падкрэсліў актуальнасць праблемы распаўсюджвання недакладнай інфармацыі пад выглядам дакладнай.

«Вядома ж, у нацыянальным заканадаўстве з'явіцца дадатковая адказнасць для тых людзей, якія займаюцца распаўсюджваннем ілжывай, непраўдзівай інфармацыі, тым больш выдаваючы яе ў якасці дакладнай, праверанай і дакладнай. Па розных напрамках нашага жыцця. Гэта і развіццё краіны, і ваенна-тэхнічны стан, стан рызык і выклікаў для нацыянальнай бяспекі. Гэта і стан рэчаў у галіне аховы здароўя і гэтак далей», — канкрэтызаваў ён.

Падрыхтаваны праекты заканадаўчых актаў, якія карэктуюць заканадаўства аб адвакатуры і адвакацкай дзейнасці

Іх мэта — умацаваць кадравы патэнцыял адвакатуры, забяспечыць захаванне прынцыпу законнасці ў рабоце гэтага прававога інстытута, павышэнне якасці і даступнасці адвакацкай дзейнасці, расказаў журналістам міністр юстыцыі Алег Сліжэўскі.

«У прыватнасці, законапраектам прадугледжваецца скасаванне абавязковага трохгадовага стажу работы па юрыдычнай спецыяльнасці для асоб, якія маюць намер стаць адвакатамі, — расказаў ён. — Некалькі гадоў таму гэтая норма была заканадаўствам уведзена, на сёння Калегія адвакатаў ставіць пытанне пра тое, што прыток новых кадраў у адвакатуру знізіўся, больш за тое, якасць падрыхтоўкі асоб, якія падаюць заявы на атрыманне адвакацкай ліцэнзіі, у апошнія тры гады пагаршаецца. Мы гэта бачым па працэнце станоўчай здачы кваліфікацыйнага іспыту».

Норма дасць магчымасць забяспечыць прыток добрых выпускнікоў юрыдычных ВНУ ў адвакатуру, лічыць міністр. Акрамя таго, прапануецца спрасціць парадак праходжання кваліфікацыйнага іспыту і ўступлення ў адвакатуру для асоб, якія маюць значны вопыт работы ў судах, праваахоўнай сістэме, органах юстыцыі, дадаў Алег Сліжэўскі.

Датычна павышэння даступнасці і якасці адвакацкіх паслуг прапануецца пашырыць пералікі катэгорый (грамадзян. — **«Зв.»**) і пытанняў, па якіх такія паслугі будуць аказвацца грамадзянам (у першую чаргу маламаёмасным) за кошт Калегіі адвакатаў.

Яшчэ адна норма праекта скасоўвае дысцыплінарныя камісіі і ўскладае пытанні разгляду выпадкаў, якія патрабуюць адказнасці адвакатаў, на Саветы Калегіі адвакатаў.

На нарадзе ў Прэзідэнта была таксама разгледжана прапанова вывучыць мэтазгоднасць работы адвакатаў у юрыдычных кансультацыях, адвакацкіх бюро і індывідуальна.

«Тут асноўны тэзіс — усе адвакаты павінны працаваць у аднолькавых умовах. Гэта тое пытанне, якое на працягу найбліжэйшых дзён будзе яшчэ прапрацоўвацца, і будзе ўнесена канчатковая прапанова, — дадаў міністр. — Згодна з адным з падыходаў, адвакаты, якія ажыццяўляюць дзейнасць індывідуальна і якія працуюць у адвакацкіх бюро, павінны спецыялізавацца на аказанні паслуг па грамадзянскіх і эканамічных справах. Адвакаты, якія працуюць у юрыдычных кансультацыях, могуць аказваць паслугі па ўсіх кірунках».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Сітуацыя

Штогадовая колькасць вакансій застаецца пастаяннай

Міністэрства аховы здароўя абвергла інфармацыю пра масавы адток медыкаў

У медустановах сістэмы Міністэрства аховы здароўя па выніках 2020 года працуе 48,6 тысячы ўрачоў-спецыялістаў. З 2019 года іх колькасць зменшылася на 383 чалавекі. Пры гэтым колькасць урачоў, якія працуюць у стацыянарах краіны, застаецца ранейшай — 17 тысяч. Змяншэнне адбылося за кошт урачоў пенсійнага ўзросту амбулаторна-паліклінічнага звяна. Многія з іх летась звольніліся з-за неспрыяльнай эпідэмічнай сітуацыі. Міністэрства аховы здароўя пракаментавала кадравую сітуацыю.

— У сацыяльных сетках і тэлеграм-каналах актыўна абмяркоўваецца інфармацыя аб «масавым адтоку» медыцынскіх работнікаў з Беларусі — прыводзіцца спасылка, што, па афіцыйных даных Белстата па радку «Ахова здароўя», чысты адток медыцынскіх работнікаў за студзень 2021 года склаў 754 чалавекі. Радок, на які спасылаюцца крыніцы тэлеграм-каналаў, — «Ахова здароўя і сацыяльныя паслугі». Паводле даных радка за студзень 2021 года, колькасць усіх звольненых работнікаў — 3917, колькасць работнікаў, прынятых на работу, — 3163, розніца — 754. Аднак гэтая лічба не з'яўляецца паказчыкам колькасці звольненых з арганізацый аховы здароўя медработнікаў, — адзначаюць у Міністэрстве аховы здароўя.

Па-першае, у радку «Ахова здароўя і сацыяльныя паслугі» закладзены звольненыя і прынятыя на работу як у арганізацыі аховы здароўя і прадпрыемствы сістэмы аховы здароўя, так і ў арганізацыі, якія аказваюць сацыяльныя паслугі (дамы-інтэрнаты, прытулкі, ТЦСАН і іншыя), а таксама арганізацыі, якія аказваюць санаторна-курортныя і ветэрынарныя паслугі, аргументуюць у ведамстве.

Па-другое, гаворка ідзе пра ўсіх работнікаў вышэйзгаданых арганізацый і прадпрыемстваў, звольненых або прынятых на работу, а для арганізацый аховы здароўя гэта ўрачы-спецыялісты, сярэдні медперсанал, сёстры-гаспадыні, санітаркі, кіроўцы, буфетчыцы, дворнікі, ліфцёры і іншы тэхнічны і абслугоўваючы персанал.

Паводле афіцыйнай статыстычнай інфармацыі па выніках 2020 года, у медустановах сістэмы Міністэрства аховы здароўя працуе 48 635 урачоў-спецыялістаў (у 2019 годзе — 49 018), змяншэнне склала 383 чалавекі. У 2020 годзе ў галіне працавала 8590 урачоў-спецыялістаў, старэйшых за працаздольны ўзрост, у 2019 годзе — 9548 чалавек. Асноўная прычына звальнення ўрачоў пенсійнага ўзросту ў 2020 годзе — эпідэмічная сітуацыя ў сувязі з інфекцыяй COVID-19.

— Што датычыцца пытання росту колькасці вакансій урачоў-спецыялістаў, размешчаных у Рэспубліканскім банку вакансій, адзначым, што з 4335 больш за 1500 — вакансіі ветэрынарнага ўрача. Такім чынам, на стане на 10 сакавіка 2021 года маецца 2835 вакансій урачоў-спецыялістаў. Міністэрства аховы здароўя штогод аналізуе інфармацыю аб вакансіях і патрэбах галіны ва ўрачэбных кадрах. Штогадовая патрэба ў апошнія пяць гадоў застаецца на ўзроўні 2,5-3 тысяч, — падкрэслілі ў міністэрстве.

Алена КРАВЕЦ.

Чыстая вада

Крыніца — у кожны дом

У Беларусі да 2025 года плануюць забяспечыць 100 % спажыўцоў якаснай пітной вадой. Пра гэта расказаў сёння на прэс-канферэнцыі генеральны дырэктар «Белвадаканала» Алег КОНАН, паведамляе БелТА.

«Кіраўніком дзяржавы і ўрадам пастаўлена задача да 2025 года забяспечыць 100 % спажыўцоў якаснай пітной вадой. У выніку праведзенай работы ў 2016—2020 гадах уведзена ў эксплуатацыю 646 станцый абезжалезвання, 49 населеных пунктаў было падключана да цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння. На сёння забяспечанасць спажыўцоў якаснай пітной вадой у Беларусі складае 94,7 %», — сказаў Алег Конан.

Для далейшага павышэння якасці вады, якая падаецца спажыўцам, і развіцця сістэмы водазабеспячэння зацверджана новая дзяржпраграма «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2021—2025 гады, якая ўключае падпраграму «Чыстая вада».

«Яе асноўныя задачы — забеспячэнне спажыўцоў цэнтралізаванымі сістэмамі падачы вады і вадой пітной якасці, павышэнне якасці ачысткі сцёкавых вод і надзейнасці сістэм каналізацыі. Да канца 2025 года плануецца пабудаваць па краіне больш як 860 станцый абезжалезвання, 109 населеных пунктаў перападключыць да сістэм цэнтралізаванага водазабеспячэння. У планах таксама рэканструкцыя 70 ачышчальных збудаванняў», — адзначыў Алег Конан.

На гэтыя мэты будуць выкарыстаны сродкі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, саміх прадпрыемстваў, а таксама пазыковыя сродкі міжнародных фінансавых арганізацый.

АПК

На Брэстчыне пачалі сяўбу

Снег на палях Брэстчыны растаў паўтара-два тыдні таму, і фактычна адразу ў поле выйшла тэхніка. У гаспадарках сталі сеяць шматгадовыя травы. Адначасова вядзецца падкормка азімых культур і падрыхтоўка глебы да сяўбы яравых.

Як паведаміў **намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканкама Віталій РУДЗЬ,** на наступным тыдні плануецца пачаць масавую сяўбу яравых. Летась у гэты час на ўсю моц ішла пасяўная кампанія, а цяпер умовы надвор'я прадыктавалі іншы расклад. Але ж у гаспадарках падрыхтаваліся да вясновай кампаніі і маюць намер правесці яе ў аптымальныя тэрміны.

Гэтай вясной у Брэсцкай вобласці запланавана пасеяць 393,3 тысячы гектараў яравых, у тым ліку 109 тысяч — яравых збожжавых і зернебабовых. Пасля выхадных земляробы прыступяць да сяўбы ячменю і аўса, а потым пасеюць пшаніцу і трыцікале.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Адукацыя

Кошт платнага навучання застанецца ранейшы

Павышэнне кошту навучання ў дзяржустановах адукацыі пакуль не плануецца. Пра гэта паведаміў міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА. Напярэдадні на шматлікіх інтэрнэт-рэсурсах з'явілася інфармацыя, што выйшэйшыя навучальныя ўстановы плануюць падняць цэннікі на платнае навучанне. Згадваліся, у прыватнасці, БДУ, БНТУ, БДПУ, ГДУ імя Ф. Скарыны.

— Сапраўды, пытанне павышэння кошту навучання для студэнтаў-платнікаў абмяркоўвалася на нарадзе рэктараў, — растлумачыў міністр. — Разам з тым Міністэрствам адукацыі вывучаны магчымасці ўстаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі па кампенсацыі дадатковых выдаткаў, звязаных з павышэннем з 1 студзеня бягучага года заработнай платы работнікаў ВНУ і іншых выдаткаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі на платнай аснове ў дзяржаўных установах адукацыі, і прынята рашэнне не павышаць устаноўленую плату за навучанне.

«Павышэнне заработнай платы і іншых выдаткаў на рэалізацыю адукацыйных праграм будзе ажыццяўляцца за кошт аптымізацыі іншых расходаў устаноў адукацыі», — дадаў Ігар Карпенка.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Надвор'е

Сонца свеціць, ды пакуль не грэе

А ўначы гэтымі днямі падмарозіць да мінус 6-9 градусаў

У сакавіку ў нас заўсёды так: замест стабільнага цяпла — тэмпературныя арэлі. Вось і ў першай палове тыдня адзначаўся павышаны тэмпературны рэжым, але потым перыяд адлігі змяняецца зімовым характарам надвор'я.

Ужо сёння ўдзень у многіх раёнах пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра складзе ад нуля да плюс 6 градусаў.

20 сакавіка, у дзень веснавога раўнадзенства, на надвор'е будзе ўплываць вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў халодным паветры. Паменшыцца колькасць аблокаў, у дзённыя гадзіны ўсё часцей стане свяціць сонца. Уначы і раніцай на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер прагназуецца пераважна заходні з пераходам на заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 3-9 марозу, удзень — ад нуля да плюс 5 градусаў.

Таксама будзе сонечна і ў нядзелю. У гэты дзень у асноўным захаваецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Толькі раніцай і ўдзень у паўночна-заходніх раёнах Беларусі адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту, тут пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным мокры снег. Уначы і раніцай на асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца заходні парывісты, раніцай і ўдзень у асобных раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 3-8 марозу, удзень — ад мінус 1 градуса да 6 цяпла.

У панядзелак надвор'е будуць фарміраваць франтальны раздзел і няўстойлівая паветраная маса, якая паступае з паўночнага захаду Еўропы. Зноў павялічыцца і ўшчыльніцца воблачнасць. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны, удзень месцамі пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца заходні з пераходам на паўночны ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 7 градусаў, удзень — ад мінус 1 да 6 цяпла.

Паўночны вецер чакаецца і ў аўторак. Будзе пераменная воблачнасць пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай на асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 1 да 8 марозу, месцамі — да мінус 10 градусаў. Удзень будзе ад 1 да 8 градусаў са знакам плюс. Нягорача — пакуль.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Канцлер Аўстрыі заявіў, што вакцынацыя ператварылася ў геапалітычны канфлікт

Вакцынацыя насельніцтва ад новага каранавіруса ператварылася ў геапалітычны канфлікт, у якім Еўразаюз апынуўся неканкурэнтаздольны з іншымі часткамі свету. Пра гэта заявіў канцлер Аўстрыі Себасцьян Курц, паведаміла ТАСС. Ён, у прыватнасці, назваў праблемай той факт, што, напрыклад, Вялікабрытанія і ЗША хутчэй атрымліваюць вакцыны і прышчапляюць насельніцтва ад каранавіруса, чым краіны — члены ЕС. Раней Курц заявіў, што вакцыны размяркоўваюцца паміж членамі Еўрасаюза непрапарцыянальна колькасці іх насельніцтва, і, насуперак дамоўленасці кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў ЕС, у рамках кіраўніцтва Савета супольнасці маглі быць заключаны таемныя дамовы паміж фармкампаніямі і медыцынскімі чыноўнікамі еўрапейскіх краін.

У Турцыі прадухілілі 26 тэрактаў

Міністр унутраных спраў Турцыі Сулейман Сайлу паведаміў, што сілам бяспекі рэспублікі ўдалося прадухіліць не менш як 26 тэрарыстычных актаў за першыя месяцы 2021 года. Прычым адзін з іх быў папярэджаны ўчора, прыводзіць яго словы агенцтва Anadolu. Між тым паводле звестак міністэрства ўнутраных спраў Турцыі, за ўвесь мінулы год было папярэджана 152 злачынствы тэрарыстычнай накіраванасці. Сулейман Сайлу таксама заявіў, што з пачатку гэтага года ў Турцыі «абясшкоджаны 121 баявік Рабочай партыі Курдыстана».

Навукоўцы прадставілі новы доказ высокага інтэлекту кашалотаў

Яны заявілі, што кашалоты ў ранейшыя часы нейкім чынам абменьваліся інфармацыяй аб з'яўленні кітабойных суднаў, паведаміў тэлеканал «МИР24». Даследаванне правялі Хэл Уайтхед і Люк Рэндэл, якія спецыялізуюцца на вывучэнні кітападобных, і аналітык Цім Дзі Сміт. У аснову навуковай работы лягла нядаўна апублікаваныя часопісы, якія падрабязна апісваюць паляванне на кашалотаў у паўночнай частцы Ціхага акіяна. Аказалася, што ўсяго за некалькі гадоў прадукцыйнасць кітабояў знізілася на 58 працэнтаў. Навукоўцы адзначылі, што кашалоты маюць самы вялікі мозг на планеце і, верагодна, зразумелі, што людзі ўяўляюць для іх небяспеку. Гэтыя жывёлы вельмі сацыяльныя і здольныя размаўляць на вялікіх адлегласцях, перадаючы падобныя на пстрычкі гукі. Яны паведамлялі адзін аднаму пра кармавыя ўгоддзі і, на думку аўтараў даследавання, маглі таксама папярэдзваць суродзічаў пра пагрозу з боку кітабояў.

Блізкая ўлада

ВЕРТЫКАЛЬ НА СУВЯЗІ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 20 сакавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Сцяпанавіч КАРАНІК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Канстанцінавіч ЗАЯЦ. Тэл. 8 022 250 18 69;

•першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Яўгенавіч КУХАРАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

ГАЛОЎНАЕ — ПРАЦАВАЦЬ СУМЛЕННА

Аператар сувязі Алена МАРОЗЬКА.

Паштальёны *(злева направа)*: Валянціна САЦУТА, Марыя ПЕРАРЭЖКА, Ніна ПЕРАРЭЖКА.

ДАРЫЦЬ радасць і дабро, усміхацца кожнаму і ствараць сваім візітам настрой — тое, да чаго імкнуцца супрацоўнікі аддзялення паштовай сувязі № 2 г. Петрыкава Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» ў сваёй штодзённай рабоце. Ёсць у калектыве тыя, каго па праве можна назваць «сямейнымі» паштальёнамі. Яны ведаюць кожную сям'ю на сваіх участках, могуць забяспечыць кліентаў дастаўкай тавараў на густ і пад заказ. Многія чакаюць «свайго» паштальёна не толькі каб выпісаць газету, атрымаць пенсію ці дапамогу па аплаце камунальных паслуг, але і проста пагаварыць, дзеляцца работнікі аддзялення паштовай сувязі. Іх сакрэт, як доўгія гады трымаць сябе ў добрай форме, — пастаянны рух плюс свежае паветра.

Гэта дружная і стабільная ў рабоце каманда складаецца з 13 супрацоўнікаў. Узначальвае калектыў падраздзялення сувязі Алена Юркавец, а надзейным памочнікам у рабоце з'яўляецца яе намеснік Валянціна Худая.

Начальнік падраздзялення сувязі Алена ЮРКАВЕЦ *(справа)* і намеснік Валянціна ХУДАЯ.

У розныя гады супрацоўнікі Петрыкаўскага аддзялення паштовай сувязі № 2 станавіліся пераможцамі конкурсаў па правядзенні падпіскі, узнагароджваліся за добрасумленную работу. Паштальёны Людміла Зубар і Марыя Перарэшка неаднаразова траплялі на Дошку гонару Петрыкаўскага раёна, Людміла Пятроўна была адзначана таксама і на Дошцы гонару Гомельскай вобласці. Увогуле, неацэнны скарб калектыву — работнікі, якія не адзін дзясятак гадоў працуюць у падраздзяленні сувязі і рыхтуюць дастойную змену.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, Фота Алены ДАЎЖАНОК.

Суправаджаючыя *(злева направа)*: Сяргей КУЦЮРУБА, Таццяна КАРНЕЙЧЫК, Іван ЧУСТРА.

АД ПАШТОВАЙ ДА ШЧАСЛІВАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У гэты дзень пасля веснавой адлігі пачаўся моцны вецер са снегам, якім абдзьмала твар, стыхія літаральна зрывала капюшон куртакі. Але ж для рэпартажу гэтыя акалічнасці, напэўна, былі, «як па заказе».

Асаблівасць Тулава ў тым, што частка гэтага населенага пункта знаходзіцца ў межах горада: дзесяць гадоў таму адбылося далучэнне да тэрыторыі Кастрычніцкага раёна абласнога цэнтра. Астатняе — на плошчы Віцебскага раёна. У аграгарадку, цэнтры аднайменнага сельскага Савета, жыве каля 1,8 тысячы чалавек.

Тулава ведаюць многія. Напрыклад, тутэйшыя старажылы ганарацца тым, што ў савецкі час аматары мота- і аўтамабільнага кросу шмат чыталі пра тулаўскую трасу. А гоншчыкі лічылі яе адной з самых складаных у Еўропе. І традыцыя правядзення спаборніцтваў не спынілася.

На першым паверсе будынка РУП «Віцебскі занальны інстытут сельскай гаспадаркі НАН Беларусі» знаходзіцца аддзяленне паштовай сувязі «Тулава», якая абслугоўвае тэрыторыю, дзе жыве каля 4 тысяч чалавек. Ім кіруе абаяльная Людміла Батава. Яна растлумачыла, што ў калектыве пяць чалавек, у тым ліку тры паштальёны.

Пакуль размаўлялі, у аддзяленне зайшла жанчына — высветлілася, што пастаянная кліентка. Працуе ў згаданым вышэй інстытуце. Падзякавала паштавікам за тое, што яны заўсёды ветлівыя, добразычлівыя, пракансультуюць наконт паштовых паслуг і багатага выбару тавараў.

Паштальён Ірына Сакалова вельмі спяшалася выйсці на маршрут. Мне няёмка стала затрымліваць яе. Па дарозе расказала, што паштальёнам працуе са студзеня мінулага года. А раней доўгі час працавала ў Падмаскоўі. Жыццё распарадзілася так, што яна вярнулася ў бацькоўскі дом у Тулаве.

На Паштовай пачынаецца яе ўчастак. На жаль, а першай палове дня ўсе, да каго мы на гэтай вуліцы спрабавалі «напрасіцца» для кароткай размовы, адсутнічалі. Пенсіянерка Ніна Яўгенаўна Клявец жыве недалёка ад Паштовай і нам на шчасце была дома. Адразу было відаць, жанчына сапраўды рада ўбачыць сваю любімую паштальёнку. Вельмі прасіла пабыць у яе даўжэй. Але, зразумела, для паштальёна кожная хвілінка каштоўная. Таму завіталі ў госці ў дом літаральна на некалькі хвілін.

Ірыне Сакаловай вельмі прыемна, калі яе візіт прыносіць радасць. А бывае, што яе здзіўляюць сюрпрызамі. Напрыклад, на Міжнародны жаночы дзень пажылыя падарылі цукеркі. Пачула словы падзякі за тое, што яна такая пунктуальная, сваёй шчырай усмешкай паляпшае настрой.

Распаўляла паштальён пра іншых жыхароў Тулава, якія актыўна карыстаюцца паштовымі паслугамі. Напрыклад, адзін часта атрымлівае лісты з розных арганізацый. Адна мастачка свае творы адпраўляе за мяжу ў розныя краіны...

Мы яшчэ трохі прайшліся разам з работніцай пошты. З цяжкай сумкай на рэмені Ірына так хутка прасоўвалася да мэты, што я ледзь паспяваў за ёй. Спадарожніца вельмі цікава расказвала пра асаблівасці работы. Напрыклад, прызналася, што спачатку вельмі цяжка было арыентавацца ў Тулаве, каб дастаўляць карэспандэнцыю, нягледзячы на тое што сама тут жыве.

Напрыклад, ёсць тры вуліцы пад назвай Магістральная і два Магістральныя завулкі, вуліца Білеўская і чатыры аднайменныя завулкі. Адразу можна заблытацца ў некалькіх Фестывальных, Дружных... Ёсць у Тулаве і Турысцкая, Пешаходная, Каляровая, Малінавая, Акруговая, Вішнёвая, Каштанавая... і нават вуліца Шчаслівая!

Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.

❍ ДАСЛОЎНА

Дырэктар Віцебскага філіяла РУП «Белпошта» Сяргей МАКСАК:

«На Віцебшчыне каля 6,3 тысячы населеных пунктаў — больш, чым у іншых абласцях краіны. Насельніцтва абслугоўвае каля 450 аб'ектаў паштовай сувязі. І ўсе нашы кліенты, дзе б яны ні жылі, могуць атрымаць сучасныя, якасныя тэхнічныя паслугі, у тым ліку нават не выходзячы з дому. Сярод іншага філіялам арганізавана эфектыўнае супрацоўніцтва з больш чым 600 віртуальнымі крамамі вобласці.

Кліенты — гэта галоўнае для нас. Яны ведаюць, што нашы супрацоўнікі ў любую пару года, якое б ні было надвор'е, своечасова зробяць сваю справу. Высокая адказнасць за выкананне службовых абавязкаў — гэта рыса характару кожнага паштавіка Прыдзвіння».

«На прыроду са «Звяздой»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на II квартал або I паўгоддзе 2021 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2021 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

Сярод падпісчыкаў 16 красавіка 2021 года будуць разыграны 7 тэрмасумак Bradex TD 0669 і суперпрыз — маслены радыятар General Climate. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 26 красавіка 2021 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 чэрвеня 2021 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або I паўгоддзе 2021 г. і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «На прыроду са «Звяздой» чытайце ў нумары 37 газеты «Звязда» ад 26 лютага.

Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.

Тэрмін правядзення гульні — з 01.03.2021 да 30.06.2021.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3945 ад 23.02.2021 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або I паўгоддзе 2021 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

на II квартал або I паўгоддзе 2021 года

Хатні адрас і тэлефон *(абавязкова)* _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

«Апавесці пра векавечную плынь Хронаса»

Архіўны дэтэктыў. Як Генадзь Кісялёў бараніў раман Караткевіча

«Гісторыкі — не садоўнікі і не батанікі. Расліннае царства (скажам так — па-старадаўняму) звычайна цікавіць іх толькі як фон, на якім адбываюцца гістарычныя падзеі. Але і ў іх ёсць дрэва, якому яны аддаюць многа ўвагі, каля якога ім даводзіцца шмат хадзіць і завіхацца. Гэта дрэва радаводнае». Такімі словамі гісторык Генадзь Кісялёў пачаў адну са сваіх кніг... Дакладней, чарговы архіўны дэтэктыў — бо валодаў талентам ператвараць навуковыя манаграфіі ў захапляльныя творы, дзякуючы якім многія далучаліся да беларушчыны.

«Кротус Генус»

«Калі расказваю пра перыпетыі пошукаў, пра шлях да знаходкі, адчуваю, як мае ветразі напаўняюцца спрыяльным спадарожным ветрам».

Мне давялося неяк рабіць з Генадзем Васілевічам гутарку, у якой ён распавядаў пра свае пошукі аўтараў беларускіх ананімных паэм «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Калі не чыталі ягоныя кнігі пра гэта, пачытайце — самае захапляльнае чытво. Разам з аўтарам вандруем, памыляемся, выходзім на новы след... Аднойчы Адам Мальдзіс пра даследаванне Кісялёвым скарынаўскай сімволікі сказаў, што той «нутром адчуваў непарадак у асэнсаванні спадчыны першадрукара». Чуццё ў яго сапраўды было!

Згадваецца Кісялёў у сатырычнай паэме «Сказ пра Лысую Гару», якая таксама доўгі час была ананімная.

«Адкрыцця аўтара
не зробіць —
Хоць зад натрэ
да мазалёў —
Ні крот Сцяпан
Александровіч,
Ні кротус Генус
Кісялёў!»

«Кротус Генус» — так пачалі жартоўна называць у сяброўскіх колах паважанага гісторыка, аддаючы даніну ягонай даследчыцкай учэпістасці, здольнасці адкапаць хоць з-пад зямлі патрэбныя звесткі... Прынамсі, менавіта так называў яго часам Уладзімір Караткевіч.

А цяпер давайце перанясёмся ў 22 лютага 1967 года.

Мінск, аб'яднаная пасяджэнне Сакратарыята, секцый прозы і крытыкі Саюза беларускіх пісьменнікаў пад старшынствам Івана Мележа. На гэтае мерапрыемства Кісялёў прыехаў адмыслова — з Вільнюса, дзе працаваў у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Літоўскай ССР. На пасяджэнні вырашалі лёс рамана Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім».

Гэта цяпер «Каласы» называюць самай прадаванай кнігай года ў Беларусі, а вядомыя людзі краіны бяруць удзел у чытцы гэтага твора на тэлекамеру. А тады вырашалася пытанне, ці выдаваць раман асобнай кнігай. Былі зацятыя праціўнікі гэтага. Тым больш Максім Лужанін напісаў закрытую рэцэнзію па заказе выдавецтва «Мастацкая літаратура», дзе на 74 старонках выказаў свае заўвагі. Асноўная — паказваецца не жыццё народа, а лёс княскай эксплуататарскай сям'і.

Караткевіч сам звярнуўся ў Саюз пісьменнікаў, каб крытыкі вынеслі вердыкт...

«Па дарозе ў «Бочу» нікуды не збочу»

Чаму Генадзь Кісялёў не мог не прыехаць?

Сустрэліся яны з Караткевічам у Вільнюсе, куды пісьменнік прыехаў, каб збіраць матэрыял для рамана «Каласы пад сярпом тваім». Кісялёў успамінаў першую сустрэчу ў архіве: «Я бачыў яго здалёку, мелькам. Быў ён тады хударлявы, таму падаўся больш высокім, як потым. Надта сур'ёзны, засяроджаны і нейкі прасветлены. Мне падалося нават — «не от мира сего». Тады мы з ім не пазнаёміліся, хоць імя яго я збольшага ведаў і нейкую цікавасць да яго меў».



Пазнаёміў Адам Мальдзіс, завязалася сяброўства. Кісялёў дапамагаў збіраць звесткі аб паўстанні 1863 года. Караткевіч зваў яго «Кісялявічусам» і не раз гасцяваў у ягонай кватэры. Вось што ўспамінае Адам Мальдзіс:

«У Вільнюсе мы найперш пайшлі да Генадзя Кісялёва, які жыў тады з маці ў старым, ледзь не рэнесансным дворыку на вуліцы Гедрыса. Амаль насупраць было кафэ «Бочу», якое Валодзя тут жа зарыфмаваў:

Па дарозе ў «Бочу»
Нікуды не збочу.

А чуць далей Дамініканскія муры, дзе Каліноўскі сядзеў у вязніцы, і Святаянскія муры, дзе яго арыштавалі.

Аднапакаёвая кватэра Кісялёвых, вялікая, але цемнаватая і халаднаватая, таксама нагадвала не то турэмную камеру, не то манастырскую келлю. Казалі, што раней тут жыла самая вучоная віленская манашка, а ўсе сцены пакоя былі абстаўлены кнігамі. Кніг хапала і цяпер, асабліва па паўстанне 1863 года. І Караткевіч, ледзь увайшоўшы і павітаўшыся, ужо ўхапіў нешта ажно не адарваць, нават у час вячэры.

Назаўтра Кісялёў і яго сябар, гісторык Бікуліч, павялі нас у Святаянскія муры шукаць той дом і тыя сходы, на якіх здраджаны Кастусь Каліноўскі спакойна сустрэў са свечкаю ў руцэ царскіх жандараў, кажучы ім, што ён Вітажэнец. Апісанні сучаснікаў доўга не сходзіліся з рэальнасцю, бо прайшоў не адзін капітальны рамонт. Але нарэшце ў «дворыку Міцкевіча» канчаткова і цвёрда ўстанавілі: гэта было тут, у двухпавярховым флігелі справа. Усцешаны Караткевіч прапанаваў усім пайсці ў «Дайнаву», вялікі і мадэрновы рэстаран, упрыгожаны паганскімі ідаламі, пляцёнкай і свяцільнікамі «павукамі». Валодзя жартам прасіў абмяняць яму ну хоць куточак з «Дайнавы» на які літоўскі па назве горад Ашмяны ці Ліду».

Вядома ж, на даследаванні Кісялёва істотна паўплывала старажытная Вільня... Тут ён сустракаўся з легендарнай Зоськай Верас, сябраваў з яе сынам Антонам, чый бацька, Фабіян Шантыр, беларускі публіцыст і грамадскі дзеяч, быў расстраляны яшчэ ў 1920-х. Нездарма пасля, у 1981 годзе, на 50-годдзе Кісялёва, калі той даўно ўжо будзе жыць у Мінску, Караткевіч і ягоная жонка падораць яму партрэт Кастуся Каліноўскага аўтарства беларускага мастака Пётры Сергіевіча, з якім Кісялёў сябраваў у Вільнюсе.

У адной з гутарак Уладзімір Караткевіч скажа:

«Перш за ўсё я імкнуўся праўдзіва перадаць дух таго складанага і супярэчлівага часу. Узнавіць дэталі мне дапамаглі архіўныя дакументы. Часам яны пацвярджалі тое, да чаго я ўжо раней дайшоў інтуіцыяй. Прывяду адзін прыклад, але не з «Каласоў...», а з «Нельга забыць». У пралогу да рамана расказваецца аб трагічнай гібелі паўстанца 1863 года Грынкевіча. Пісаў я гэтыя старонкі, пераважна абапіраючыся на мясцовыя паданні. Потым жа, на маё ўласнае здзіўленне, Генадзь Кісялёў паказаў мне ў Вільнюскім архіве дакументы пра рэальнага Грыневіча, расстралянага пры тых жа акалічнасцях, што і апісаныя мною ў рамане».

«Гэты раман — значная з'ява»

Падчас абмеркавання лёсу «Каласоў» выступленне Генадзя Кісялёва аказалася самым аўтарытэтным. Вось як яно гучала (у стэнаграме яно падаецца на рускай мове)

«Г.КІСЯЛЁЎ: Раман У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» з'яўляецца, бадай, першым буйным шматпланавым гістарычным раманам у беларускай літаратуры [...]. Тым больш нам варта да гэтага твора праявіць беражлівае, уважлівае стаўленне, беражлівы падыход. Як кожны гістарычны раман, яго непазбежна варта ацэньваць з двух пунктаў гледжання: у мастацкіх адносінах і, па-другое, наколькі правільна адлюстроўваюцца [...] гістарычныя падзеі. Што датычыцца ацэнкі рамана «Каласы пад сярпом тваім» у мастацкіх адносінах, то, я думаю, усе дружна пагодзяцца са мной, што раман напісаны выдатна. Уладзімір Караткевіч — выдатны мастак, выдатны майстар слова. Усё, пра што ён піша, ён гэта ярка, выразна бачыць і таму ўмее перадаць карціны, створаныя яго ўяўленнем, умее данесці іх да чытача. Другое пытанне: наколькі правільна адлюстроўвае гістарычныя ён падзеі [...] у сваім рамане? Першая кніга рамана ахоплівае вялікі прамежак часу — з канца 40-х гадоў да 1861 года, да самага пярэдадня паўстання 1863 года... Мне прыйшлося падняць нямала матэрыялаў па паўстанні 1863 года [...], і я магу сказаць, што Уладзімір Караткевіч вельмі правільна разабраўся ва ўсіх складаных супярэчнасцях гэтай эпохі, якую ён адлюстроўвае. Ён добра знаёмы з дакументамі, яму дапамагае ў многіх выпадках выдатная інтуіцыя мастака [...]. Могуць спытаць, чаму аўтар абраў героем свайго рамана сына князя, хіба людзі з такой высокай лесвіцы хадзілі да народа? Мы ведаем: бывалі такія факты, і пісьменнік-дэмакрат Альгерт Абуховіч паходзіў з буйных памешчыкаў [...]. Аўтару важна паказаць сувязь свайго любімага героя Алеся Загорскага з народам, што ад народа ён запазычыў свае найлепшыя рысы. Гэтае дзядзькаванне неабходна было аўтару, каб абмаляваць цікавую постаць дзеда Алеся Загорскага — старога Вежы. Ён — вальтэр'янец, чалавек незалежны, заўзяты ненавіснік усякага цемрашальства і рэлігіі. Нездарма аднаго свайго ўнука ён пакінуў у праваслаўі, а іншага хрысціць па каталіцкім абрадзе. Такі чалавек цалкам мог успомніць аб старым звычаі дзядзькавання і аддаць унука на выхаванне селяніну [...]. Можа ўстаць пытанне такім чынам: а ці не занадта аўтар малюе моцным нацыянальна-вызваленчы рух у Беларусі ў той час? Такога папроку аўтару зрабіць нельга, бо 1863 год — гэта цікавы год, год імкнення рэвалюцыянераў зліцца з народам. І ў Беларусі гэта выявілася ў тым, што найлепшыя прадстаўнікі шляхты, якія былі апалячаныя, цалкам перахадзілі на бок народа. Асабліва добра я гэта зразумеў, калі, займаючыся біяграфіяй Арцёма Вігдарэўскага, выявіў яго словы, што «з беларушчынай я не разбратаўся, можа быць, дарэмна марную на яе сілы. Што ж рабіць? Нічога, пакамкаць шапку» [...]. Калі я працаваў над біяграфіяй Арцёма Вігдарэўскага і пасля таго, як «Полымя» надрукавала ў скарочаным выглядзе раман Караткевіча, я здзівіўся, як Караткевіч, не будучы знаёмы з гэтымі матэрыяламі, мог уявіць сабе карціны грамадска-палітычнага жыцця таго часу. Я, вядома, мог бы назваць тыя ці іншыя невялікія адхіленні аўтара ад гістарычнай ісціны, але прынцыповых заўваг у гэтым плане ў мяне няма. Усё гэта дробязі, якія лёгка выправіць пры самай невялікай рэдакцыі. На завяршэнне я павінен сказаць, што раман Караткевіча — трэба гэта падкрэсліць — працяты гуманізмам, напісаны з яркіх інтэрнацыяналістычных пазіцый, працяты душэўным святлом, душэўнай чысцінёй аўтара. Гэта значная з'ява ў беларускай літаратуры, вялікі ўклад у беларускую літаратуру [...]».



Надпіс на адвароце партрэта Кастуся Каліноўскага, падоранага Генадзю Кісялёву.

Раман удалося адстаяць, «Каласы» былі выдадзеныя — хоць аўтару давялося пайсці на кампрамісы, скарачаць, пагаджацца з праўкамі.

«Як бы не пашкодзіць часам, не адламаць, не адсекчы лішне якую галіну»

Дунін-Марцінкевіч, Вярыга-Дарэўскі, Альгерд Абуховіч, Францішак Багушэвіч, Альберт Паўловіч, Павел Шпілеўскі... Сотні імёнаў, створана ўражальная панарама XIX стагоддзя ў беларускай літаратуры, з якога на слыху было раней некалькі імёнаў... Помню, як вычытала ў кнізе «Героі і музы» пра мінскага музыканта Дамініка Стафановіча, настаўніка Станіслава Манюшкі. Кісялёў знайшоў дакументы, як той з жонкай адкрыў у Мінску жаночы пансіён і як быў капельмайстрам гарадскога аркестра, што размяшчаўся ў ратушы і іграў на адкрытай галерэі яе другога паверху... І такая яркая карціна старасвецкага Мінска ўявілася, што пасля ўвасобілася ў творах.

А вось у той жа кнізе Кісялёў зачапіўся за адзін радок: элегію Каратынскага паклаў на музыку селянін з Навагрудчыны Вінцэсь Клімовіч... І пачынаецца расследаванне! Клімовіч выявіўся паўстанцам, знайшоўся нават ягоны фотаздымак у следчай справе — модны гарнітур, ланцужок гадзінніка... Кісялёў высвятляе, што музыка да элегіі напісаная ў высылцы... Што брат і шаснаццацігадовая сястра Клімовіча таксама сасланыя ў Сібір...

«У трывалага дрэва гісторыі ёсць магутныя галіны, ёсць проста лісце. Усе разам яны ствараюць крону. Чым пышнейшая яна, тым багацейшы на духоўныя здабыткі народ... Зразумела, першы наш клопат — галоўныя галіны. Але і кожны найменшы атожылак шмат можа апавесці пра няспынны бег часу, векавечную плынь Хронаса, пра ўрокі мінулага, пра тое, «чым ёсць для народа ўпадак і хвала». І яшчэ баліць і рупіць — як бы не пашкодзіць часам, не адламаць, не адсекчы лішне якую галіну, ужо не гаворачы пра тое, як было, напрыклад, у часы сталінскіх беззаконняў або ў вайну, калі злыя перуны безупынна білі ў дрэва жыцця, калі Дрэва Беларусі страціла ці не ўсю зялёную чупрыну, — выратавалі толькі ўчэпістыя карані, што схаваліся глыбока пад зямлёй. Ачомалася, адышло Дрэва, зноў зашумела сакавітым лісцем».

Тое, што напісаў Генадзь Кісялёў пра галіны і атожылкі Беларускага Дрэва, не страціць каштоўнасці ніколі.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Открытое акционерное общество
«Молодечненский завод металлоизделий»
(продавец)
проводит открытый аукцион по продаже:

имущества, расположенного по адресу: Минская область, Молодечно, ул. Промышленная, 4, в составе

Здания, ограждение, сети

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

Найлепшая рэакцыя — вырашэнне праблемы

Як званок на прамую тэлефонную лінію старшыні Мінскага гарсавета дэпутатаў Андрэя БУГРОВА спачатку стаў нагодай для вывучэння актуальнага пытання ў профільнай камісіі з наступным яго разглядам на сесіі Савета, а потым ператварыўся ў значны сацыяльны праект.

А тады летась размова па тэлефоне з мінчанкай завязалася вакол збору і правільнай утылізацыі пратэрмінаваных лекаў і медыцынскіх прэпаратаў, якія сотні тысяч гараджан рэгулярна выкідваюць у кантэйнеры для звычайных бытавых адходаў. А далей яны закопваюцца на палігонах, што ў рэшце рэшт небяспечна для экалогіі, здароўя людзей, хутчэй за ўсё будучых пакаленняў жыхароў сталіцы. А гэта няправільна. Трэба паставіць справу ўтылізацыі медыцынскіх прэпаратаў такім чынам, каб глеба, вада і людзі былі надзейна абаронены ад наступстваў распаду рэчываў. Бо дзясяткі тысяч дробных таблетак у сваёй масе нясуць схаваную пагрозу для чалавека і жывёл, пераконвала Андрэя Бугрова яго суразмоўніца.

Яе шчырая заклапочанасць злабадзённай і не бачнай для многіх іншых мінчан праблемай знайшла разуменне ў старшыні гарадскога Савета. Ён паабяцаў узяць гэты званок на кантроль, потым пагаварыў з калегамі па Савеце, высветліў, што яны думаюць наконт гэтага. Дэпутаты выказаліся на карысць распрацоўкі канкрэтнай праграмы дзеянняў па ўтылізацыі пратэрмінаваных лекаў і медыцынскіх прэпаратаў. Што і казаць, пытанне сапраўды надзённае і не вартае доўгага вывучэння.

Мясцовай уладай горада пастаўлена задача: у красавіку распачаць збор пратэрмінаваных лекаў і медыцынскіх прэпаратаў. Падрыхтоўку і ход яе рэалізацыі сумесна з гарадскімі зацікаўленымі службамі дэпутаты днямі грунтоўна разгледзелі на чарговым пасяджэнні пастаяннай камісіі па гарадской гаспадарцы, транспарце і сувязі Мінгарсавета. Да размовы былі запрошаны прадстаўнікі Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, РУП «Белфармацыя», дарэчы, самай буйной аптэчнай сеткі Беларусі, і іншыя юрыдычныя асобы. Іх тлумачэнні, удакладненні і каментарыі ў значнай ступені спрыялі плённай размове.

— Гэта пасяджэнне ў пэўным сэнсе нагадвала зверку гадзіннікаў. Бо трэба было канчаткова дамовіцца з усімі зацікаўленымі бакамі аб старце з 1 красавіка эксперымента па зборы і ўтылізацыі пратэрмінаваных лекаў і медыцынскіх прэпаратаў. Так, менавіта эксперымента. Спачатку мы прыкладна ў 20 мінскіх аптэках і паліклініках (ахопім усе раёны сталіцы) паглядзім пэўны час, як ідзе працэс, што атрымліваецца, а што і не зусім. А ўжо потым будзем глядзець, у якім кірунку рухаць справу надалей, — гаворыць **старшыня камісіі гарсавета па гарадской гаспадарцы, транспарце і сувязі Алег АЎРУЦІН.**

Вядома, найлепшы адказ на зварот грамадзяніна — аператыўнае вырашэнне праблемы, з якой звярнуўся чалавек на прамую тэлефоную лінію. Але так не заўсёды атрымліваецца. На думку суразмоўніка, варта ўважліва ставіцца і аналізаваць слушныя звароты мінчан, якія нясуць у сабе цікавую ідэю, карысную прапанову. Даваць дарогу іх рэалізацыі. І такіх канструктыўных зваротаў на тэлефоны Мінскага гарадскога Савета падчас прамых ліній паступае ўсё больш.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

Папулярнасць прыносяць справы

Што цікавіць клічаўскіх школьнікаў і пра што марыць вядомы на ўсю краіну тутэйшы ўзорны фальклорны калектыў «Купалачка».

І з тымі, і з іншымі **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Святлана ШУТАВА** сустрэлася падчас свайго візіту ў Клічаўскі раён, што на Магілёўшчыне.

Яна чалавек папулярны ў сваёй акрузе. І нават па дарозе ў раён была магчымасць у гэтым пераканацца. Заехалі на аўтазапраўку, каб напоўніць бак аўто (а на сваёй машыне няўрымслівая дэпутатка намотвае па раёнах да 32 000 кіламетраў за год), і на хвілінку забеглі ў кавярню выпіць кубачак кавы. На гадзінніку толькі сем раніцы, а напярэдзе шмат сустрэч. «Вітаю, Святлана Аляксандраўна! Як вашы справы?» — нечакана спыталася маладая жанчына за прылаўкам. «А мы знаёмы?» — здзівілася мая спадарожніца. «А як жа. Вы ж наш дэпутат і часта тут бываеце», — усміхнулася жанчына.

Падчас візітаў у свае раёны (Глускі, Асіповіцкі і Клічаўскі) Шутава паспявае і прыёмы правесці, і ў працоўных калектывах пабываць, і з ветэранамі або шматдзетнымі маці сустрэцца, і з моладдзю пагутарыць. Гэты раз не стаў выключэннем. У клічаўскай школе № 1 напярэдадні Дня Канстытуцыі арганізавалі маладзёжную дыялогавую пляцоўку, куды запрасілі і Святлану Шутаву.

Клічаўскую моладзь цікавіла, якую ролю адыгралі дыялогавыя пляцоўкі ў падрыхтоўцы да Усебеларускага народнага сходу, як сёння заахвочваецца моладзь, прасілі расказаць пра якасці сапраўднага грамадзяніна і як іх у сабе выхаваць.

Клічаўскія школьнікі агучылі свае пытанні.

— Гэта трэці Усебеларускі народны сход, у якім я брала ўдзел, і ён сапраўды адрозніваўся ад папярэдніх па сваім напале і жаданні грамадзян згуртавацца і зберагчы сваю краіну, — адзначыла Святлана Аляксандраўна. — Ад насельніцтва паступіла 17 тысяч прапаноў, і гэта радуе. Радуе і тое, што мая акруга актыўна далучылася да гэтага працэсу, людзі прапаноўвалі рэальныя рэчы. Асабіста мяне натхніла тая вялікая ўвага, якая ў гэтай пяцігодцы аддаецца рэгіёнам. Іх плануецца зрабіць больш камфортнымі для жыцця і работы. Такія гарады, як Клічаў, атрымаюць другое дыханне. Сёння тут ёсць праблемы з транспартам, працаўладкаваннем, зарплатай, і іх трэба вырашаць. Жыхары раёна звяртаюцца да мяне з надзённымі жыццёвымі пытаннямі. Клічаву, напрыклад, не хапае аўтамойкі, а ў дварыі аднаго з шматпавярховікаў няма дзіцячай пляцоўкі. Агучваліся прапановы ўдасканаліць мемарыял Усакіна, забяспечыць раённую бальніцу апаратам УГД. Сёння бальніца атрымала два медыцынскія апараты, вядзецца збор сродкаў для рэканструкцыі мемарыяла. Пытанні, калі іх прагаворваць, вырашаюцца.

Што датычыцца моладзі, то сёння на дзяржаўным узроўні створаны ўсе ўмовы для раскрыцця яе творчага, спартыўнага і інтэлектуальнага патэнцыялу. Аказваецца падтрымка маладым сем'ям і маладым спецыялістам. Юнакам і дзяўчатам трэба ўсё гэта цаніць, вучыцца адрозніваць, што добра, а што можа паставіць пад пагрозу інтарэсы дзяржавы.

У гэты ж дзень Святлана Шутава сустрэлася з працоўнымі калектывамі Клічаўскага лясгаса і раённай дзіцячай школы мастацтваў. Раён славіцца сваімі моцнымі культурнымі традыцыямі. Клічаўская дзіцячая школа мастацтваў яскравае таму пацвярджэнне. У ёй і яе філіялах займаецца 360 дзяцей. Акрамя гэтага існуюць платныя групы як для зусім яшчэ маленькіх дзяцей, так і для дарослых, узрост якіх не абмежаваны. Тут створаны ўсе ўмовы для развіцця творчай асобы, маецца добрая матэрыяльна-тэхнічная база. Але музычныя інструменты, як бы беражліва да іх ні адносіліся, пры такой колькасці выхаванцаў вельмі хутка зношваюцца. Таму вельмі арганічна прагучала просьба да Святланы Шутавай дапамагчы знайсці спонсараў для набыцця некаторых з іх. Прафесіяналы, якія тут працуюць, зацікаўлены ў якаснай падрыхтоўцы будучых музыкантаў. Трэба падтрымаць і вядомы ў краіне і за яе межамі ўзорны фальклорны ансамбль «Купалачка», які працуе пры школе мастацтваў. Дарэчы, сёлета спаўняецца 25 гадоў з моманту ўтварэння ансамбля. Так што ёсць нагода.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 18 сакавіка 2021 года.

ФУТРА З ВІЛЬНІ, альбо Аб тым, як я завяла карову

...Во якія часы насталі: тавараў — хоць заваліся! Бедныя гандляры чаго толькі не прыдумаюць, каб неяк збываць: то зніжкі аб'явяць, то акцыі, то распродаж, то нават дастаўку... Ты толькі плаці. Гэта — цяпер, а вось некалі... Ёсць што ўспомніць.

У нашай вёсцы крамка была ў невялічкім здымным пакойчыку, і куплялі мы там самае неабходнае: соль, запалкі, мыла, што-нішто з прадуктаў... Само сабой — цыгарэты з віном (гэта чамусьці таксама тавар «неабходны» — пры любой уладзе...). А вось калі з'яўлялася патрэба ў адзенні, абутку ці нейкіх рэчах, дык па гэта ўжо ў Вілейку, Плешчаніцы, Мінск, а то і наогул...

Неяк наш саўгас арганізаваў паездку ў Вільню. Ахвотных сабралася — цэлы аўтобус, шмат хто ехаў упершыню...

Дзве сястры — Ніна і Аня — у гэтай сталіцы ўжо бывалі, горад трохі ведалі, таму па крамах пайшлі асобна: і ў нейкія дробныя зазіралі, і па ўнівермагу прайшліся... А потым спыніліся ды нарыкаюць: маўляў, толькі дзень струбілі — і тут нічога няма.

— А што б вы хацелі? — пытае ў іх нейкая вяртлявая маладзічка.

Аня ў адказ:

— Ніне паліто зімовае трэба, ды, відаць, не купім у вас — не сезон.

— Ну чаму ж гэта? — шматзначна ўсміхаецца незнаёмка. — Летам трэба і сані рыхтаваць, і вопратку... Падыдзіце вунь да той жанчынкі (дамачка паказала на прадавачку, што сумавала каля кранштэйнаў з сукенкамі) — яна дапаможа.

І сапраўды, акінуўшы вокам беларусак, тая гандлярка падвяла іх да нейкіх дзвярэй і ўручыла... чорненькае лёгенькае футра. Цуд ды і толькі! Ніне ён нават не сніўся! А грошай — падумала — неяк удзвюх наскрабём...

І сапраўды, за футра — сабралі (прадавачка яго ўжо спакавала), а вось каб «на лапу» даць, дык ні рубля няма. Што рабіць? Ніна руку ў кішэнь, — там паперка ляжыць — спіс пакупак. І памерам якраз з дваццацьпятку...

Далей усё пайшло як па нотах: Аня аддае грошы за тавар, Ніна адной рукой суне прадавачцы тую паперку, другой — бярэ абнову і абедзве — ходу, подбегам, амаль да аўтобуса.

...Уляцелі ў яго, а там ужо людзі сабраліся — гамоняць, шамацяць пакункамі. Сёстры таксама дух перавялі, — пахваліліся Нінінай абноўкай, расказалі, з якімі прыгодамі набывалі, услых падумалі, як тая прадавачка будзе разлічвацца з «наводчыцай».

— А як вы, дурніцы, будзеце з міліцыяй? — папытаўся раптам кіроўца. — Вас жа, мусіць, шукаюць ужо? Чэка няма, значыць, футра ўкралі?!

Сёстры — як не самлелі ад страху, пакуль хлопец рагатаць не стаў. А за ім — увесь чыста аўтобус...

Што цікава, на гэтым гісторыя не скончылася, бо муж Ніны тое футра не ўпадабаў, сказаў, што жонка ў ім — як кадушка: хоць бяры ды каці...

Значыць, рэч трэба было прадаваць. Падумалі, каму? А мы жылі з імі побач... Я памерала: «мой гардэробчык», яно — як тут і было!

Вось так, без блату і прыгод, у растэрміноўку і з дастаўкай дадому, я займела шыкоўную рэч! Не паверыце: лета на дварэ, а я зімы дачакацца не магу: раз-пораз люстэрка на табурэт (трумо яшчэ не было), у футра прыбяруся ды любуюся: лёгенькае, мякенькае...

Праўда, неўзабаве паехалі мы ў госці да родных майго мужа (мае бацькі вельмі рана памерлі), за сталом — ну вядома ж — пахваліліся нечаканай пакупкай. Бачу — свякроў не рада: цяжка ўздыхае ды кажа мне: «Шчаслівая... У футры паходзіш. А я вось усё жыццё пражыла, а нейкай людскай вопраткі і не мела, і, відаць, не займею...

Такім чынам футра з Вільні хутка апынулася ў новай гаспадыні (во дзе радасці было — да слёз! Гэта ж такі падарунак нявестка зрабіла!)

Не засталася ў даўгу і свякроў: бліжэй да восені ў мяне з'явілася... карова.

Трэба сказаць, што я не вельмі яе хацела, але ж не прыняць не магла.

Любоў Чыгрынава,

г. Мінск.

АПОШНЯЕ ПАПЯРЭДЖАННЕ.

І зусім не кітайскае

«Будзе мне, будзе і табе» — гэта абяцанне з адной добра вядомай казкі. «Будзе табе, як Лідачцы» — гэта ўжо з нашых, мясцовых показак.

Хто такая Лідачка і як яна ўвайшла ў гісторыю? Досыць проста, на жаль, бо тая Лідачка гнала самагонку. Многія мужчыны, маючы грошы, купляліся яе, а не маючы, — здаралася, з дому цягнулі ўсё, што маглі — рэчы, прадукты... Лідачка брала: не баялася ні міліцыі, ні праклёнаў, ні пагроз...

Але ж да пары да часу, і час той настаў, калі адзін з пастаянных «кліентаў» перанёс да Лідачкі амаль цэлы кубелец сала: жонка верхні пласт падняла, а пад ім цагліны ляжаць...

Думаеце, яна адну цагліну ўхапіла і пабегла да самагоншчыцы?

Не, жанчына паехала туды на кані, прыхапіўшы каністру з вадой і запалкі.

Дабраўшыся да месца, яна паліла траву каля хаты, паклікала адтуль Лідачку і загадала:

— Ану цягні, ану выкладвай тое, што мой п'яніца да цябе перанёс!.. А калі не паслухаеш, — дык запалкай чыркану, і ўсё добра тваё дымам пойдзе!

Спужалася Лідачка: вынесла з хаты цэлы абярэмак: там і посуд, і новае пасцельнае, і тое ж сала.

— Кладзі ўсё на воз, — загадала «госця», — сама конна садзіся. Да сельсавета з табой паедзем.

У самагоншчыцы выйсця няма: зрабіла ўсё, як ёй загадалі.

Працэсія атрымалася яшчэ тая: каб на яе паглядзець, усе людзі на вуліцу павыходзілі.

...Што за размова ў сельсавеце была, «разведка», на жаль, не данесла. Але ж гнаць самагонку Лідачка перастала. Мусіць, паверыла, што гэта было апошняе папярэджанне, за якім...

Чым чорт не жартуе, калі бог спіць...

С. А.,

Слуцкі раён.

НЕ ТАКІ ВОЎК СТРАШНЫ...

Шмат размоў цяпер пра службу ў войску. Хтосьці ідзе туды з надзеяй, што чалавекам зробяць, хтосьці ставіць мэту «адкасіць» — любымі сродкамі, хтосьці лічыць: «Трэба, дык трэба»...

Мы — за савецкім часам — думалі гэтаксама: ішлі, служылі і вярталіся дамоў, прычым ледзьве не героямі, бо ў кожнага парадны кіцель ажно ззяў ад значкоў! Да таго ж за спінай быў жыццёвы досвед (не важна, дзе ды кім ты служыў), а ўжо запас армейскіх гісторый... З маёй, пра Ахмета, хлопцы доўга смяяліся.

Значыць, служыў я ва ўзводзе кіравання артылерыйскага палка. Навабранцы ў нашу каманду адбіраліся пажадана з дыпломамі аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі, з добрым веданнем рускай мовы...

Як да нас трапіў Ахмет, засталося загадкай, бо ў войска (па словах землякоў) яго «замялі» з нейкага горнага паселішча, з чортавых кулічак. У школу там ён, падобна, не хадзіў: па-руску ведаў, можа, слоў 10 і вучыць іх зусім не хацеў...

Аднак дужы быў — як сапраўдны асілак! Уявіце: на кожнае плячо мог пасадзіць па чалавеку, абодвух — лёгка панесці... Што часцяком і рабіў: у казарме пасля адбою хлопцы падводзілі Ахмета (а той і не супраць...) да табурэткі ці падаконня, самі адтуль залазілі яму на плечы, «вешаліся» на шыю, на рукі, а ён потым нёс... «Фішка» была ў тым — як далёка... Хто з «наезнікаў» колькі ўтрымаецца...

Весела, карацей, усім, хоць мы выступалі нейкай дробнай шантрапой, Ахмет жа — сапраўдным волатам і героем (баяўся — як казалі яго землякі — толькі жанчын).

...Такі быў Ахмет у пачатку службы, такі ён застаўся і ў самым канцы. Яго ўжо збіраліся адпраўляць дамоў, калі хлопец раптам... прапаў! Як скрозь зямлю правалiўся! Мы прачасалі ўсё наваколле — лясы, палі, пабудовы... Чалавека няма... Камандзір палка, баючыся наступстваў, проста месца сабе не знаходзіў!

А салдат назаўтра вярнуўся, прычым шчаслівы — ну як жаніх на вяселлі!

— Дзе ты быў?! — спытаў яго дзяжурны, калі той няспешна падышоў да варот КПП.

Ахмет урачыста, з гонарам, кінуў:

— На ба́бах!

Гэта быў дастойны адказ дастойнага чалавека, які — вярнуўшыся адтуль — не баіцца болей нічога: ні турмы, ні начальства... Галоўнае — ён там пабыў! І новае слова запомніў з «вялікай магутнай мовы»...

Факт, што Ахмета — можа, з радасці, што знайшоўся? — ніяк не пакаралі, адправілі дамоў. А ён, пакуль ад'язджаць, землякам расказаў, як трапіў да адной маладзіцы, як дровы ёй пакалоў і мужам пабыў, хоць суткі.

Прызнаўся яшчэ, што яму спадабалася і дома ён адразу ажаніцца.

Іван Гаральчук,

г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

ПРАГРАМНАЯ ПАМЫЛКА

Як ламаецца тое, чаго не паправіш

Ужо амаль паўгода прайшло, але не ідзе з галавы (а сёння дык і ўвогуле прыснілася) цётка Валя. Такая, якой бачыла яе апошні раз на пахаванні сына — на старым інвалідным вазку, у звалянай цёплай кофце, а дрыжачыя рукі моцна трымаюць цэлафанавы пакецік, у якім ляжаць усе яе грошы — пара пакамечаных дзясятак. І кожны раз працінае гэта паскуднае пачуццё: сумесь палёгкі, што мяне гэта мала датычыць, і незразумелай віны, што не магу хоць неяк дапамагчы.

Утой жнівеньскай вільготнай задусе каля мінскай дзясятай бальніцы, дзе ў цёмнай падсобцы, прыстасаванай пад рытуальную залу для маламаёмых, ляжаў у труне як Толік, мы ўбачыліся ўпершыню за гадоў мо пятнаццаць. Хоць мы і даволі блізкія сваякі, і жывём у адным горадзе, а нагоды сустрэцца за гэты час не знайшлося. Ведала толькі, што жыве цётка з малодшым сынам, які нідзе не робіць і п'е, што некалькі гадоў назад яна зламала шыйку сцягна і не можа хадзіць. Але гэта быў абсалютна не мой клопат — у яе ёсць дарослыя дзеці і ўнукі.

Да таго ж цётка ў маім уяўленні з дзяцінства была абсалютна іншай — прыгожай, дагледжанай, гарадской. Калі яна з дзядзькам прыязджала да нас у вёску на новенькім «масквічы», я на нейкі момант пераставала дыхаць, гледзячы на яе. Зграбная, заўсёды ў новай сукенцы, з моднай завіўкай «пад Анджэлу Дэвіс», з водарам свежай парфумы, з вялікімі залатымі завушніцамі ў вушах... Яна здавалася пасланніцай таго дзівоснага сталічнага свету, у які трэба імкнуцца, каб вырвацца з вёскі, ад балота і гною. Гэта пасля я даведалася, што, каб купіць той «масквіч» і завушніцы, цётка, акрамя працы на заводзе, мыла пад'езды ва ўсіх навакольных дамах. І эканоміла — кожны кавалачак, кожную капейку. Цягала з лесу вёдрамі і торбамі грыбы і ягады, з агарода брала ўсё, што вясковыя сваякі прапаноўвалі. Круцілася як магла, каб кватэра, каб машына, каб усяго ў доме хапала.

Не для сябе старалася — для дзяцей. Два хлопцы раслі, не маючы ні ў чым адмовы. Але ж выхоўвала іх па-свойму, з уласным разуменнем дабра і дабрабыту. Старэйшага з васьмі класаў адправіла ў «хабзу», бо там забяспечвалі адзеннем і кармілі ў абед. Малодшага, які з дзяцінства быў хваравіты, шкадавала, але таксама па-свойму — дазваляючы рабіць усё, што хоча. Не хочаш рабіць урокі — не рабі, пабіўся з дзяўчынкай у двары — дзяўчынка вінавата, на яе трэба накрычаць, а свайго па галаве пагладзіць і цукерку даць. Калі гэты самы малодшы — ужо ніякае не хваравітае дзіця, а здаровы бэйбус — прыйшоў з арміі, ён не стаў уладкоўвацца на работу, а шчыльна прысеў на карак яшчэ здаровых і адносна маладых бацькоў.

Яны ўшасцёх (старэйшы ажаніўся, нарадзілася дачка) жылі ў каапературнай двухпакаёўцы, якая калісьці здавалася прасторнай, а раптам стала цеснай. Праўда, ні адзін, ні другі сын ніяк не рупіўся, каб сітуацыю неяк змяніць. Маці, ужо не такая маладая і спрытная, па-ранейшаму мыла пад'езды, цягала торбы і слоікі, бацька, перадавік вытворчасці, абіваў парогі выканкамаў, каб палепшыць жыллёвыя ўмовы. Неяк незаўважна з цёткі знік той сталічны лоск, які раней заварожваў. На галаву яна стала завязваць хустку, пад якой не было ўжо ні пышнай прычоскі, ні цяжкіх завушніц, калісьці модны фіялетавы плашч стаў паныла-бэжавым. Праўда, купілі старэйшаму новую машыну і пабудавалі яшчэ адну кватэру, у якую нарэшце з'ехалі ад маладых...

Праз пару год захварэў, амаль аслеп, а хутка і памёр муж. Але яе не пакінулі адну — якраз малодшы, які ўжо паспеў двойчы ажаніцца і развесціся, апынуўся фактычна на вуліцы і, як заўсёды, без работы. Па прывычцы сеў на матчын сагнуты ўжо карак, па прывычцы яна яго прыняла. Доўгі час на пенсіі падпрацоўвала, каб была якая лішняя капейка. Бо сынок часцей жыў на яе грошы, чым на свае, а праз колькі часу да іх падсяліўся хутка падрослы ўнук — гэткі самы гультай і недарэка, як і яго бацька. З бацькам у іх была яшчэ адна агульная рыса — абы выпіць. Вось і п'янствавалі на яе грошы. А не давала — забіралі.

Аднойчы ўнук штурхнуў яе так, што зламала шыйку сцягна. Прыкаваная да інваліднага вазка, яна апынулася ў поўнай залежнасці ад алкашоў. Ад сям'і старэйшага сына ніякай спагады не мела, толькі нявестка званіла часам і чыхвосціла на чым свет стаіць, што п'яніцу выхавала (старэйшы таксама пачаў піць).

З гарэлкі, казалі, і памёр. Прыехаўшы з ім развітацца, я ледзь пазнала яго дарослых дзяцей, пастарэлую насцярожаную жонку. І цётку. У старой звалянай кофце, у пабляклай хустцы, на спрэс заматаным ізалентай інвалідным вазку, вузкія веласіпедныя колы якога ўпэўнена выпісвалі «васьмёрку», яна моўчкі сядзела ля труны сына, падобная на вялікую нязграбную птушку... Да яе нікому не было справы. Малодшы не прыехаў нават развітацца з братам, а нявестка з унукамі, убачыўшы мяне, якую на вуліцы і не пазналі б, з радасцю кінуліся з просьбай: можа, ты яе дадому завязеш?

Я наняла сацыяльнае таксі, прывезла яе да пад'езда, перадала сыну, які з пахмелля мяне нават не пазнаў. А яна запрашала мяне ў хату і спрабавала ўсунуць мне ў руку пакамечаную дзясятку, якую дастала з пакета, што моцна трымала пры сабе, і на якую прагна ўтаропіўся мутнымі вачыма яе сынок...

І гэта карціна раз-пораз узнікае ў мяне перад вачыма ўжо амаль паўгода. Кожны раз думаю: дзе, у якім месцы адладжаная праграма гэтага канкрэтнага жыцця, канкрэтнага лёсу дала збой? Ці можна было нешта зрабіць, каб гэты збой папярэдзіць? Ці стане гэта праграмная памылка для кагосьці навукай?

Пытанні ўсе рытарычныя. Праўду кажуць, што з гадамі становішся філосафам...

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

Таямніцы айчыннай гісторыі

ЯК ХРУШЧОЎ САМАГОНШЧЫКАМ

З адабраных у якасці рэчавага доказу 4,5 літра самагону

У Савецкім Саюзе спробы барацьбы з п'янствам рабіліся неаднойчы. Першая антыалкагольная кампанія была атрымана бальшавікамі ў «спадчыну» ад царскага ўрада. Адразу пасля прыходу да ўлады Петраградскі рэўваенсавет выдаў загад ад 8 лістапада 1917 года, які абвяшчаў: «да асобага распараджэння забараняецца вытворчасць алкаголю і ўсялякіх алкагольных напояў». Ва ўмовах нэпа ад падобнай жорсткай палітыкі давялося адмовіцца.
З пачаткам калектывізацыі і індустрыялізацыі савецкі ўрад ініцыяваў у 1929 годзе «па патрабаванні працоўных» масавае закрыццё піўных і іншых піцейных установ, дзе ўжываўся алкаголь. Іх пераабсталёўвалі ў сталоўкі і чайныя. Было арганізавана выданне часопіса «Трезвость и культура», які ганьбіў п'янства і прапагандаваў здаровы спосаб жыцця. У гады другой пяцігодкі, у межах выканання задачы стварэння для працоўных заможнага жыцця, барацьба з п'янствам і алкагалізмам сцішылася.

57 «гарэлачных» месцаў Прывакзальнай плошчы

Да канца 1957 годзе да Хрушчова прыйшло разуменне таго, што маштаб, якога дасягнула п'янства ў краіне, можа паставіць крыж на мары аб хуткай пабудове камуністычнага грамадства. Паводле падлікаў карэспандэнта газеты «Чырвоная змена», у сярэдзіне 1950-х гадоў на Прывакзальнай плошчы Мінска дзейнічала 37 пунктаў, якія гандлявалі гарэлкай. З месцаў паведамлялі, што пасля заканчэння працоўнага дня ў гарадах рабочыя арганізавана ідуць у крамы, купляюць гарэлку і распіваюць у скверах, дварах, пад'ездах. Напрыклад, за 1957 і першую палову 1958 года ў гарадскім выцвярэзніку пабывала больш за 240 рабочых і служачых Магілёўскага завода штучнага валакна, у тым ліку галоўны механік, начальнік цэха вентыляцыі і нават члены партбюро прадпрыемства.

Шмат прыхільнікаў Бахуса было сярод савецкай інтэлігенцыі. Газета «Літаратура і мастацтва» паведамляла 28 жніўня 1954 года: «У Саюзе пісьменнікаў БССР недапушчальна слаба займаюцца выхаваннем літаратараў, тут не створаны нецярпімыя адносіны да парушальнікаў асноў савецкай маралі... Нярэдка яшчэ можна бачыць, калі асобныя пісьменнікі і ў прыватнасці А. Бялевіч, К. Цітоў і С. Майхровіч у нецвярозым выглядзе з'яўляюцца ў грамадскіх месцах, непрыстойна сябе трымаюць, кампраметуючы высокае званне савецкага літаратара... У Саюзе даўно было вядома, што сістэматычнымі выпіўкамі і дэбошамі А. Рылько ганьбіць званне пісьменніка, з'яўляючыся на пасяджэнне бюро ў нецвярозым стане». Да прыхільнікаў Бахуса газета беларускай інтэлігенцыі залічыла таксама акцёраў Купалаўскага тэатра Кудраўцава і Іванова, якія праз шкодную звычку «перасталі расці і ўдасканальваць сваё майстэрства».

Не менш трывожнае становішча склалася на вёсцы, дзе на савецкія і рэлігійныя святы запівалі брыгадамі і цэлымі калгасамі на некалькі дзён, не выходзячы на палі і фермы. Многія вяскоўцы не маглі дазволіць сабе гарэлку — пры сярэднім месячным заробку ў сельскай гаспадарцы ў 450 рублёў цэны на яе вагаліся ад 21 рубля 20 капеек за звычайны «сучок» да 30 рублёў 70 капеек за бутэльку «Сталічнай». Таму калгаснікі ўжывалі самагон, вытворчасць якога ў сярэдзіне 1950-х гадоў набыла ўнушальныя памеры. Асабліва раздражняў першага сакратара ЦК КПСС той факт, што прыватныя вытворцы выраблялі самагон з калгаснай сыравіны — збожжа, бульбы, цукру і іншага.

277 605 літраў брагі — «улоў» за адзін год

Старт агульнасаюзнай хрушчоўскай антыалкагольнай кампаніі быў дадзены 22 студзеня 1958 года ў Мінску. Выступаючы падчас кароткатэрміновага візіту ў БССР для ўдзелу ў нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі, Хрушчоў сказаў: «Надышоў час рэзка паставіць пытанне аб барацьбе з п'янствам, а таксама з тымі, хто гоніць самагонку». Беларускае кіраўніцтва адразу ж распачало энергічную барацьбу з прыкрай перашкодай на шляху будаўніцтва камунізму. Міліцыі дапамагаў камсамол. Напрыклад, Лідскі гаркам камсамола сумесна са штабам народных дружын стварылі спецыяльныя групы па барацьбе з самагонаварэннем у раёне. Абвяшчаліся дні барацьбы з самагонаварэннем.

За першыя 7 месяцаў 1958 года было ліквідавана 1 305 «ачагоў» самагонаварэння ў Гомельскай вобласці, 1 210 — у Мінскай, 1 122 — у Віцебскай, 1 045 — у Гродзенскай, 933 — у Маладзечанскай, 825 — у Магілёўскай вобласці. На працягу ўсяго 1958 года ў насельніцтва рэспублікі было адабрана 277 605 літраў брагі, 23 581 літр самагону, а таксама 12 385 самагонных апаратаў, 5 308 з якіх знайшлі ў Віцебскай вобласці.

Дадатковы імпульс кампанія атрымала 4 красавіка 1958 года, калі ЦК КПСС звярнуўся да партыйных арганізацый краіны з лістом пра ўзмацненне барацьбы з п'янствам і самагонаварэннем, паставіўшы задачу рашучай барацьбы з імі ўсімі сродкамі і спосабамі. Апошнія словы сведчылі пра тое, што партыйнае кіраўніцтва не збіраецца абмяжоўвацца антыалкагольнай прапагандай, а таксама канфіскацыяй самагонных апаратаў і самаробных напояў. Пра рэпрэсіўны характар кампаніі, да правядзення якой былі прыцягнуты праваахоўныя органы, сведчаць наступныя лічбы.

У 1958 годзе ў БССР усяго па крымінальных артыкулах было асуджана 38 178 чалавек, з іх 8 347 — за самагонаварэнне. Колькасць асоб, асуджаных у рэспубліцы ў 1958 годзе, павялічылася ў параўнанні з папярэднім годам на 38 %, пераважна за кошт самагошчыкаў. Гэта была адна з найбольшых лічбаў сярод савецкіх рэспублік у пераліку на душу насельніцтва. Усяго ў СССР у 1958 годзе было асуджана 52 143 самагоншчыкі, г. зн. у чатыры разы меней на душу насельніцтва, чым у БССР.

Такім чынам, самагоншчыкі зрабіліся найбольш шматлікімі правапарушальнікамі ў рэспубліцы, апярэдзіўшы традыцыйных лідараў — раскрадальнікаў дзяржаўнай маёмасці і хуліганаў. З усіх 8 347 асуджаных у 1958 годзе паводле 149 артыкула тагачаснага Крымінальнага кодэкса БССР, які за выраб самагону толькі з мэтай продажу прадугледжваў пакаранне ад штрафу да 2 гадоў пазбаўлення волі, абсалютная большасць (8 091 чалавек) выраблялі алкагольны напой для ўласнага ўжытку. 1 326 з іх атрымалі гадавыя і двухгадовыя тэрміны турэмнага зняволення, астатнія — штрафы і папраўчыя работы па месцы працы. У якасці юрыдычнай падставы для пакарання тых, хто выраблял самагон для ўласных патрэб, беларускія праваахоўнікі скарысталі ўказ Вярхоўнага Савета СССР ад 7 красавіка 1948 года, згодна з якім выраб самагону без мэты продажу караўся зняволеннем тэрмінам ад 1 да 2 гадоў.

Галоўныя самагоншчыкі — жанчыны і старыя

Адной з тых, хто ў 1958 годзе атрымаў двухгадовы тэрмін, была жыхарка г. п. Урэчча Слуцкага раёна Фісун. З'яўляючыся самагоншчыцай са стажам, яна ператварыла сваю хату ў сапраўдны шынок, дзе за грошы частавала суседзяў. Падчас ператрусу і затрымання яна аказала супраціўленне супрацоўнікам міліцыі, а таксама спрабавала знішчыць рэчавыя доказы.

Каля 60 % асуджаных па «самагонным» артыкуле былі жанчыны, прыкладна столькі ж — асобы старэйшыя за 40 гадоў, хоць доля гэтых груп насельніцтва ў агульнай колькасці асуджаных паводле крымінальных артыкулаў вагалася ў межах 20 %. Гэтая асабівасць тлумачылася тым, што вырабам самагонкі ў асноўным займаліся тыя, хто адказваў у сем'ях за хатнюю гаспадарку, не быў заняты ў грамадскай вытворчасці. Акрамя таго, людзі сталага веку і жанчыны з непаўналетнімі дзецьмі бралі на сябе ўсю адказнасць, ведаючы, што суд улічыць іх узрост і абавязкі маці.

Выраб і ўжыванне самагону зрабіліся адной з традыцыйных практык мясцовага насельніцтва, да якой паблажліва ставіліся і старшыні калгасаў, і ўчастковыя міліцыянеры, і суддзі. У верасні 1958 года Мазураў атрымаў паведамленне намесніка міністра юстыцыі БССР Басава, у якім пералічваліся шматлікія выпадкі міліцэйскіх злоўжыванняў. Так, з адабраных участковымі ўпаўнаважанымі Суражскага аддзялення міліцыі Калугай і Майсеевым у якасці рэчавага доказу 4,5 літра самагону да суда дайшло толькі 0,5 літра. Лейтэнант Лагішынскага аддзела міліцыі Луд у пратаколе адабрання пазначыў 13 літраў знойдзенага самагону, у той час як панятыя ў судзе паказалі, што знойдзена было 24 літры. Участковы Лунінецкага аддзела Прыка перад адабраннем знойдзенага самагону «апрабаваў» яго разам з панятым Мельянцом, пасля чаго апошні заснуў за сталом і не мог даваць паказанняў на судовым пасяджэнні.

Многія выканкамы Саветаў дэпутатаў працоўных паставіліся да правядзення антыалкагольнай кампаніі фармальна. Ніякіх мерапрыемстваў па барацьбе з самагонаварэннем у 1958 годзе не распрацавалі ў Ашмянскім, Докшыцкім, Радашковіцкім, Вілейскім, Глыбоцкім, Бешанковіцкім, Лёзненскім, Лепельскім, Расонскім, Пінскім, Лагішынскім, Целяханскім, Столінскім, Клічаўскім, Крычаўскім, Слаўгарадскім, Чэрыкаўскім і некаторых іншых раёнах. А ў Столінскім, Кобрынскім і Кіраўскім раёнах самагонныя апараты былі знойдзены нават у дэпутатаў мясцовых органаў улады. Ахвярамі антыалкагольнай кампаніі сталі дырэктар Дубойскай СШ Столінскага раёна Урбановіч, дырэктар Мядзельскага цагельнага завода Голубеў, а таксама падабраны міліцыяй у беспрытомным стане інструктар Магілёўскага райкама партыі Лужкоў.

Зварыў, выпіў — у турму

У снежні 1958 года старшыня Вярхоўнага суда БССР Шардыка зрабіў аналіз судовай практыкі па справах аб вырабе і продажы самагону. Яго вынікі, прадстаўленыя партыйнаму кіраўніцтву рэспублікі, суправаджаліся наступнай прапановай: у сувязі з тым, што больш за 96 % самагону вырабляецца сялянамі для ўласных патрэб і з уласнай сыравіны, прадугледзець за падобную дзейнасць адміністрацыйнае, а не крымінальнае пакаранне. Меліся шматлікія факты крымінальнага пераследу па «самагонным» артыкуле добрых работнікаў, некаторыя з якіх з'яўляліся ўдарнікамі камуністычнай працы. Высокі чыноўнік не мог адкрыта сказаць, што сяляне

НЕ ДАЎ РАДЫ І П'ЯНІЦАМ

да суда дайшло толькі 0,5 літра

выраблялі самагон таму, што іх сямейны бюджэт не дазваляў набыць на вяселле ці хаўтуры казённую гарэлку.

Словы тых, каму на справе даводзілася праводзіць ідэі Хрушчова ў жыццё, не былі пачуты — партыйнаму кіраўніцтву было патрэбна хуткае і эфектыўнае вырашэнне праблемы. 1 верасня 1959 года Казлоў падпісаў пастанову Вярхоўнага Савета БССР «Аб узмацненні барацьбы з п'янствам і самагонаварэннем». Пастанова забараніла продаж гарэлкі ва ўсіх прадпрыемствах гандлю і грамадскага харчавання (акрамя рэстаранаў), размешчаных на вакзалах, аэрапортах, на прывакзальных і прыстанцыйных плошчах. Не дазваляўся продаж гарэлкі ў непасрэднай блізкасці ад прамысловых прадпрыемстваў, навучальных і дзіцячых устаноў, бальніц, санаторыяў, а таксама ў месцах масавых гулянняў і адпачынку. За з'яўленне ў нецвярозым стане альбо ўжыванне алкаголю ў грамадскіх месцах пастанова прадугледжвала штраф у памеры 100 рублёў (у выпадку абцяжарваючых абставін ён падвойваўся). За выраб самагону спаганяўся штраф у памеры 500 рублёў (у выпадку паўторнага парушэння ён падвойваўся). За продаж самагону пагражала турэмнае зняволенне тэрмінам ад года да пяці.

У прынятым у 1960 годзе новым Крымінальным кодэксе БССР з'явіўся артыкул 59 «Прымусовыя меры медыцынскага характару, ужываемыя да алкаголікаў і наркаманаў». Размова ў ім ішла пра адпраўку алкаголікаў, паводле хадайніцтва таварыскага суда, калектыву альбо медыцынскай установы, на лячэнне ў медыцынскія ўстановы са спецыяльным лячэннем і працоўным рэжымам. Акрамя таго, над тымі, хто ўласнымі дзеяннямі ставіў сям'ю ў цяжкае матэрыяльнае становішча, рашэннем суда магло быць установлена апякунства.

«Садавіна-гародніна» таксама можа быць распівачнай

Былі зроблены захады па прывучэнні насельніцтва да культурнага ўжывання алкагольных напояў. У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў БССР ад 20 чэрвеня 1959 года «Аб зніжэнні рознічных цэн на некаторыя тавары народнага спажывання» патаннелі вінаградныя віны — на 19,2 %, пладова-ягадныя — на 20 %.

У выніку выканання пастановы «Аб узмацненні барацьбы з п'янствам і самагонаварэннем» паменела колькасць пунктаў па продажы алкаголю, але не аб'ёмы ўжываемага спіртнога. Напрыклад, у 1960 года ў сталіцы БССР штодня можна было ўбачыць групы распіваючых алкагольныя напоі мужчын у прывакзальным скверы, кафэ-аўтамаце на вуліцы Свярдлова, ларку «Піва-воды» на вуліцы Маскоўскай, прыстанцыйным скверы ў раёне вуліцы Козыраўскай, гарадку будаўнікоў на вуліцы Кавальскай, парку ў раёне 1-га цагельнага завода, таксаматорным парку на вуліцы Апанскага. Распівалі ў піўных ларках і побач з уваходамі ў вінна-гарэлачныя аддзелы крам. Жыхары дамоў на Прывакзальнай плошчы, дзе знаходзіліся гастраномы № 3 і № 95, не рызыкавалі ў іх заходзіць, бо там штодня адбываліся



скандалы і бойкі. Аматары Бахуса ператварылі ў распівачную краму «Садавіна-гародніна» па вуліцы Кірава, 3. Нелегальны продаж спіртнога быў наладжаны нават у буфеце Беларускага тэатра імя Янкі Купалы. У Мінску пачалася спекуляцыя гарэлкай.

Не лепшыя поспехі былі ў тых, хто змагаўся з п'янствам на вёсцы. Захады «зверху», накіраваныя на аздараўленне савецкага грамадства, сяляне ўспрымалі як абсурдную акцыю, накіраваную супраць простага народа. Месца выяўленага самагоншчыка адразу займаў новы. З іншага боку, продаж спіртнога ўвесь час павялічвалі райспажыўсаюзы, якія часта гандлявалі алкаголем у забароненых пастановай ад 1 верасня 1959 года месцах. Напрыклад, у сярэдзіне 1960-х гадоў буфет Лепельскага раённага дома культуры штогод рэалізоўваў да 15 тысяч бутэлек гарэлкі.

У выніку піць меней не сталі ні гараджане, ні вяскоўцы, і неўзабаве хрушчоўская кампанія па барацьбе з самагошчыкамі і п'яніцамі сама сабою спынілася. Алкагольныя ўцёкі насельніцтва ад суровай рэчаіснасці таталітарнай сістэмы, сацыяльнай бяпраўнасці і матэрыяльнай незабяспечанасці працягнуліся. Калі ў 1960 годзе міліцыя і дружыннікі падабралі на вуліцах беларускіх гарадоў і вёсак 20 700 асоб у стане востры алкагольнай інтаксікацыі, то ў 1965 годзе іх колькасць павялічылася да 67 000. Сярод іх было 12 студэнтаў Мінскага медыцынскага інстытута, 21 студэнт БДУ імя Леніна, 33 студэнты Беларускага інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі і звыш 100 студэнтаў Беларускага політэхнічнага інстытута.

У 1961 годзе ў рэспубліцы былі выяўлены 8233 нецвярозыя кіроўцы, што было на 2108 больш, чым у 1960 годзе. У Мінску колькасць зарэгістраваных фактаў п'янства ў грамадскіх месцах за 8 месяцаў 1960 года склала 1879, а за той жа перыяд 1962 года — 5148. На лячэнне ў рэспубліканскім псіханеўралагічным дыспансеры стаяла вялікая чарга хворых на алкагалізм. Тады ж абмяркоўвалася магчымасць стварэння для алкаголікаў лячэбна-працоўных аддзяленняў у месцах зняволення.

Гэтая сумная статыстыка вымусіла партыйнае кіраўніцтва рэспублікі распачаць новыя антыалкагольныя захады. 9 ліпеня 1965 года выйшла пастанова Прэзідыума ЦК КПБ «Аб незадавальняючым стане барацьбы з п'янствам і самагонаварэннем у рэспубліцы». Яе першыя вынікі былі несуцяшальныя, што, перш за ўсё, тлумачылася рэпрэсіўным характарам пастановы. Так, колькасць асуджаных у БССР за першае паўгоддзе 1966 года павялічылася ў параўнанні з тым жа перыядам 1965 года на 31,1 % пераважна за кошт самагоншчыкаў. Выступаючы ў сакавіку 1966 года на XXVI з'ездзе КПБ, П. Машэраў быў вымушаны прызнаць, што кожнае другое крымінальнае злачынства ў рэспубліцы адбываецца на глебе п'янства. 23 красавіка 1966 года па ініцыятыве новага беларускага лідара выйшла пастанова Прэзідыума ЦК КПБ «Аб мерах па ўзмацненні барацьбы з п'янствам і самагонаварэннем». Наперадзе было павышэнне цэн на спіртныя напоі, абмежаванне часу іх продажу, стварэнне лячэбна-працоўных прафілакторыяў і гарбачоўская антыалкагольная кампанія 1985—1990 гадоў.

Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ.

Асобы

ДАСЛЕДЧЫК ПОЎНАЧЫ БЕЛАРУСІ

У музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі адкрылася выстаўка, прысвечаная 170-годдзю з дня нараджэння гісторыка, археографа і краязнаўца Аляксея Сапунова. Таксама выстаўка ладзіцца ў межах мерапрыемстваў, прымеркаваных да стагоддзя галоўнай кніжнай скарбніцы краіны.

«Некалькі стагоддзяў мы гублялі спадчыну. З Беларусі вывозіліся культурныя скарбы, расцярушваліся па свеце, нішчыліся ў тым ліку ў выніку войнаў, але дзякуючы стварэнню Нацыянальнай бібліятэкі, архіўнай службы, музеяў пачалося яе збіранне, і гэты працэс працягваецца, — заўважыў падчас адкрыцця экспазіцыі **намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Аляксандр СУША.** — Я ўпэўнены, што гэта выстаўка дазволіць па-новаму прыадкрыць нам вельмі яскравую асобу ў гісторыі беларускай культуры і крыху па-іншаму паглядзець, як нараджаўся працэс вывучэння Беларусі, асэнсавання нацыі, і як гэты шлях быў пройдзены канкрэтнай асобай».

Усё жыццё і дзейнасць Аляксея Сапунова (1851—1924) былі звязаны з паўночнай Беларуссю. Адным з самых першых даследчыкаў ён звярнуў увагу на тое, што на той час людзі больш ведалі гісторыю замежных краін і нічога не маглі расказаць пра сваю. Ураджэнец Віцебскай губерні, ён стаў першым даследчыкам роднага краю. Распрацаваў курс «Беларусазнаўства». Пры гэтым быў не проста гімназічным выкладчыкам, аўтарам некалькіх дзясяткаў манаграфій і соцень артыкулаў, але і стваральнікам многіх ініцыятыў. Аляксей Парфенавіч — адзін з ініцыятараў і заснавальнікаў Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея, Віцебскай вучонай архіўнай камісіі і іншых навуковых устаноў.

На выстаўцы можна ўбачыць яго рукапіс пад назваю «Беларуская бібліяграфія», гэта першае даследаванне ў такім кірунку.

Ён шмат у чым быў першы, дзякуючы яму пачалося даследаванне Барысавых камянёў, паўночнабеларускіх легендаў, ён выдаў працы, прысвечаныя Заходняй Дзвіне і гісторыі Віцебскай губерні. Як археограф, даследаваў і апісваў старажытныя пісьмовыя помнікі, быў ініцыятарам публікацыі шматлікіх вельмі значных для нашай культуры архіўных дакументаў, схем, графікаў, чарцяжоў, партрэтаў, аўтографаў.

Сапуноў сабраў унікальную бібліятэку. Напрыканцы жыцця сваю багатую калекцыю матэрыялаў ён не распрадаў, не раздаў, не згубіў, а прапанаваў захаваць. Асобнікі з яго кнігазбору ў 1923 годзе паступілі ў фонд Беларускай дзяржаўнай і ўніверсітэцкай бібліятэкі (цяпер Нацыянальная бібліятэка Беларусі). У зборах Аляксея Сапунова быў і Статут Вялікага Княства Літоўскага. У архіве захаваўся дакумент, які пацвярджае, што ўнікальныя выданні з калекцыі Сапунова, у тым ліку і Статут, былі перададзены ў 20-х гадах у толькі што створаную Нацыянальную бібліятэку. На жаль, на сёння каштоўная гістарычная крыніца захоўваецца не ў Беларусі.

Выстаўка «Руплівец беларускай даўніны» створана на ўнікальных матэрыялах з асабістага архіва і бібліятэкі Аляксея Сапунова. На ёй пададзены найбольш каштоўныя кнігі даследчыка, на некаторых з іх — дарчыя надпісы самога аўтара.

Да арганізацыі экспазіцыі прычыніўся Віцебскі абласны краязнаўчы музей — адзіны ўладальнік асабістага архіва Алексея Сапунова, які налічвае больш за 600 адзінак захавання. І значная частка матэрыялаў выстаўкі якраз прадстаўлена віцебскім музеем. Напрыклад, тут пададзена ліставанне Аляксея Парфенавіча з іншымі даследчыкамі. Кнігі з бібліятэкі збіральніка з уладальніцкімі штампамі, на якіх пазначана прозвішча і ініцыялы вучонага, а таксама пячатка, якой ён іх рабіў.

У змешчанай на выстаўцы кнізе, прысвечанай 25-годдзю навуковай і творчай дзейнасці Сапунова, можна пабачыць пазнакі, удакладненні, якія пакінуў ён сам. Ёсць тут і сшытак з сачыненнямі юнага Сапунова, калі той вучыўся ў Віцебскай мужчынскай гімназіі, яго студэнцкі канспект, радавод і рукапісы вучонага.

Прадстаўлены літаграфіі, планы, факсіміле дакументаў, прац, у тым ліку яго «Віцебскай даўніны», без знаёмства з якой і сёння не абыходзіцца ні адзін з даследчыкаў поўначы Беларусі. Таксама ў экспазіцыі змешчаны ўнікальны рукапіс «Гісторыі г. Віцебска», сама кніга, нягледзячы на тое што ўжо была падрыхтавана да друку, так і не выйшла.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703**
Продавец	**ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38. Тел. + 375 29 688-04-88**

Предмет аукциона

Лот № 1
Местоположение – **г. Минск, ул. Замковая, д. 33-6**

Наименование (назначение)	Общ. пл.	Инвентарный номер
Административно-торговое помещение	733,5 кв. м	500/D-7023833

Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 2 344 680,00 бел. руб. (снижена на 10 %)
Шаг аукциона – 117 234,00 бел. руб.

Лот № 2
Местоположение – **г. Минск, ул. Замковая, д. 33-1а**

Кабинеты (административное помещение)	87,9 кв. м	500/D-708041778

Составные части и принадлежности: открытая автостоянка пл. 523 кв. м

Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 428 760,00 бел. руб. (снижена на 10 %)
Шаг аукциона – 21 438,00 бел. руб.

Порядок ознакомления: в рабочие дня по предварительному согласованию по тел. +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения аукциона.
С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации или явки на аукцион одного участника предмет аукциона может быть продан данному участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 %

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона, исчисляемое в процентном соотношении от цены продажи (2 % – по лоту № 1; 3 % – по лоту № 2), в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 20.01.2021

Дата и время проведения аукциона	**06.04.2021 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»
Дата, время начала и окончания приема заявлений	**С 09.00 19.03.2021 до 17.00 05.04.2021,** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@ipmconsult.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Рованичи» (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЖИЛОГО ДОМА

(составные части и принадлежности: 2 пристройки, подвал, сарай, погреб), **инв. № 615/С-42197 общей площадью 102,4 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625883801601000091 площадью 0,1679 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Червенский район, Ляденский с/с, д. Большая Гануть, ул. Озерная, 11.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона реки Гануть пл. 0,1679 га.

